ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

№ 168 | Субота, 1 жніўня 1931 г. | № 168

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, „ рэдактара 1-73, „ сакрат. і х-ры . . 72.

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгаснікаў . . . — р. 80 к. Для ўстаноў . . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь": Для рабочых, служачых і калгаснікаў . . . 1 „ — „ Для ўстаноў . . . . 1 „ 20 „

Плата за абвесткі: За радок мятыту . . . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . . . 40 „ Пры шматразовым друкаванні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

Прызначаная на сеньня агульна-гарадзкая дэманстрацыя, прысьвечаная міжнароднаму чырвонаму дню, адмяняецца.

Працоўныя Віцебску праводзяць міжнародны чырвоны дзень 1-га жніўня на прадпрыемствах, у сваіх клюбах, садох і г. д., дзе будуць арганізаваны мітынгі і вечары, прысьвечаныя гэтаму дню.

1-е жніўня—мабілізацыя усіх пралетарскіх сіл на актыўную рэвалюцыйную барацьбу супроць небясьпекі новай вайны і абарону Савецкага Саюзу

НАША ПАЛІТЫКА—ЁСЬЦЬ ПАЛІТЫКА МІРУ. ГЭТУ ПАЛІТЫКУ МІРУ БУДЗЕМ ВЕСЬЦІ НАПЕРАД УСІМІ СІЛАМІ, УСІМІ СРОДКАМІ" (Сталін).

МІЖНАРОДНЫ АНТЫВАЕННЫ ДЗЕНЬ

1-е жніўня зьяўляецца днём ляду рэвалюцыйных сіл міжнароднага пралетарыяту для барацьбы з небясьпекай новых імпэрыялістычных войн і рыхтуючымся нападам імпэрыялістых на СССР. У бягучым годзе дзень 1-га жніўня праходзіць у значэ больш складаных, чым у мінулыя гады, абставінах. З аднаго боку, яны характарызуюцца далейшым, рэзкім паглыбленьнем сусьветнага эканамічнага крызису капіталізму і наступленьнем у радзе краін прадпасылак рэвалюцыйнага крызису, з другога—гіганцкімі посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, завяршаючага падмурку падмурку сацыялістычнай эканомікі.

Разьдзіраемы ўнутранымі супэчнасьцямі, усё ўзмацняючыміся ў зьвязку з паглыбленьнем сусьветнага крызису, сусьветны капіталізм перш за ўсё шукае выхаду з гэтага крызису кошт працоўных, за кошт сялёній і за кошт СССР.

У гэтых умовах міжнародны капіталізм зноў ставіць пытаньне аб разьвязаньні гістарычных супэчак паміж капіталізмам і сацыялізмам шляхам вайны» (з тэзісаў 11 га пленуму ІККІ). Але наша партыя і ўрад няўхільна і цьвёрда вялі і вядуць палітыку міру. СССР, краіна будуючагася сацыялізму, барацьбітчына сусьветнага пралетарыяту, ня хоча вайны. Гэта даказана шматлікімі фактамі і гэтага ня могуць адмаўляць нават многія заклятыя ворагі Савецкага Саюзу. Ня гледзячы на гэта, небясьпека нападу на Савецкі Саюз узмацняецца разам з абвастрэньнем агульнага крызису капіталізму.

Гэтак чаму дзень 1-га жніўня бягучым годзе павінен праходзіцца пад знакам шырачайшай мабілізацыі працоўных СССР і ўсяго сьвету на барацьбу з новымі імпэрыялістычнымі войнамі і пагрозай нападу імпэрыялістых на СССР.

Гэта кампанія павінна паслужыць магутным сродкам для растлумачэньня шырачайшым мам рабочых і працоўных лёзунгу «СССР—ударная брыгада міжнароднага пралетарыяту», а таксама тых інтэрнацыянальных мерак, якія стаяць у зьвязку з гэтым перад рабочай клясай Савецкага Саюзу.

У дзень 1-га жніўня мы павінны ясна і шырэй растлумачыць і ўсвоіць сутнасьць мірнай палітыкі нашай партыі і ўраду і тых мерапрыемстваў, якія праводзіцца нашым урадам у барацьбе за мір.

Разам з тым перад працоўнымі СССР стаіць задача—яшчэ шырэй мабілізаваць арганізаваную волю і рэвалюцыйны энтузіязм рабочае клясы і працоўных для ўмацаваньня абароназдольнасьці Саветаў, баявой і тэхнічнай магутнасьці РСЧА. Яшчэ шчыльней згуртоўваючы свае шэрагі вакол партыі і яе ленінскага ЦК, яшчэ больш напружваючы свае сілы для завяршэньня пабудовы падмурку сацыялістычнай эканомікі ў СССР, ужо ў бягучым годзе мы павінны памятаць, што ўмацаваньне абароны краіны перш за ўсё азначае забесьпячэньне далейшых бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага наступу па ўсяму фронту, далейшага аўладаньня тэхнікай і рашучую барацьбу за выкананьне народна-гаспадарчага пляну 3-га рашаючага году. Мы павінны памятаць, што вялікі размах індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі падвозіць магутную базу пад нашу абароназдольнасьць і тэхнічную рэканструкцыю Чырвонай арміі — вярнейшы аплот дыктатуры пралетарыяту.

Наш абавязак—умацаваць рабочае шэфства над Чырвонай арміяй, усямерна забясьпечыць далейшае баявое і тэхнічнае ўдасканаленьне Чырвонай арміі.

Такія масавыя дабраахвотныя арганізацыі, як ТДА-Авіахэм, Аўтадор, РОКК і інш. павінны рашуча перабудаваць сваю работу, каб уцягнуць рабочых, калгаснікаў, беднякоў і серадняковаў-аднаасобнікаў у справу падрыхтоўкі к абароне краіны. У сваю чаргу працоўныя масы павінны прыняць самы актыўны ўдзел у рабоце гэтых арганізацый, у першую чаргу на прадпрыемствах і ў сацэктары вёскі.

У дзень 1-га жніўня рабочая кляса і працоўныя масы СССР, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый яшчэ шчыльней згуртуюць свае шэрагі вакол генэральнай лініі партыі і прадэманструюць перад усім сьветам сваю волю к перамозе на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, рыхтуючыся да канца змагацца за справу міру, а калі будзе патрэбна, за зброяй у руках абараняць межы краіны будуючагася сацыялізму.

Разам з пралетарыятам і ўціснутымі масамі ўсяго сьвету яны ператвораць дзень 1-га жніўня ў дзень баявога агляду сваіх сіл, у дзень рашучай барацьбы супроць насоўваючайся новай імпэрыялістычнай вайны і пагрозы інтэрвэнцыі супроць СССР, у дзень рашучай барацьбы за перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Мэталісты запрашаюць дэлегацыю працоўных Зах. Беларусі на Кастрычніцкае сьвята

Ліст рабочых заводу «Чырвоны мэталіст» рабочым і працоўным сялянам Заходняй Беларусі

Дарагія таварышы!

1-е жніўня—дзень барацьбы супроць ваеннае небясьпекі, супроць рыхтуючайся капіталістамі інтэрвэнцыі проці Савецкага саюзу—адзінай у сьвеце краіны, дзе пераможна будуецца сацыялізм.

Мы хочам падзяліцца з вамі, братамі па клясе, аб нашых дасягненьнях, а таксама аб тых цяжкасьцях, якія стаяць на нашым шляху.

Наш завод вырас з маленькай майстэрні ў 1917 г. у вялікі завод па будаўніцтву сельскагаспадарчых машын і на сёньняшні дзень налічвае 1100 рабочых, якія **на 75 проц. ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, змагаюцца за выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, за выкананьне праграмы пяцігадовага пляну па сельгасмашбудаўніцтву ў тры гады.**

За апошнія тры гады з нашага заводу ўзяты, як вылучэнцы, для працы на вёсцы ў якасьці 25-тысячнікаў 300 чал., у тым ліку для адказнай партыйнай і прафсаюзнай і гаспадарчай работы. Апрача таго, каля 100 чал. вучыцца ў вышэйшых навучальных установах, дзе з іх рыхтуюцца спэцыялістыя для нашае сацыялістычнае гаспадаркі. Наша партыйная арганізацыя налічвае 311 камуністаў, а ў камсамол уцягнута 94 проц. усёй кавуўнай рабочай моладзі заводу Наш завод адчувае вялікую патрэбу ў прытоку кваліфікаванай рабсілы: фармаўшчыкоў, такароў, сьлесараў і інш., а таксама адчувае недахоп у мэталях. З болем у сэрцы мы павінны перад вамі канстатаваць, што наш прамфінплян па заводу ня выконваецца на ўсе 100 проц., што зьяўляецца вынікам недастатковай мабілізацыі ўсіх рабочых і тэхнічных недаладак. У нас значна палепшыліся бытавыя ўмовы для рабочых нашага заводу—пабудаван пасёлак, а зараз будуецца дом на 120 сямей, мы маем свае сталоўкі і рабочы каапэратыў. Наша заробчая плата ў сярэднім складае 5 р. 20 к. у дзень

Для культурнага абслугоўваньня рабочых у мінулым годзе пабудаваны клюб, кожны рабочы зьяўляецца падпішчыкам 2—3 газэт і часопісаў. Апрача таго, на заводзе выдаецца друкаваная газэта адзін раз у тры дні, а ў кожным цэху выдаюцца насьценныя газэты, якія ўпарта змагаюцца супроць недахопаў, маючых месца на заводзе, мабілізуюць думку рабочых вакол выкананьня прамфінпляну заводу, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за чыстату шэрагаў ленінскай партыі, супроць розных ухілаў ад адзіна правільна ленінскай генэральнай лініі партыі.

Заціўкаленыя сваёй вытворчасьцю, гаспадарамі якой зьяўляюцца самі рабочыя, мы выносім прапановы наконт спрашчэньня і рацыяналізацыі працэсаў і мэтадаў работы, за лепшыя прапановы рабочыя прэміруюцца. З пачатку году па заводу ў-ёсена 136 прапаноў, якія далі заводу 17 тысяч руб. эканоміі. Для аказаньня канкрэтнай дапамогі палітзьняволеным капіталістычных краін мы ўзялі шэфства над адной з турмаў. Мопраўская арганізацыя налічвае шмат рабочых, якія штомесячна ўплачваюць членскія ўзносы і апрача таго, рабочыя заводу адпрацавалі 2 гадзіны ў карысьць пабудовы інтэрнацыянальнага дому для дзяцей палітзьняволеных капіталістычных краін. **Мы кядаўна ўзялі шэфства над грамадзянскай школай лётнікаў і адлічваем аднадзённы заробак у карысьць пабудовы ангару, што дасьць 4 тысячы руб.**

Мы таварышы, ведаем, што нашы дасягненьні выклікаюць шалёную нянавісьць да Савецкага саюзу з боку капіталістычных дзяржаў і таму мы адначасова, будуючы сваю гаспадарку, ўзмацняем абароназдольнасьць нашае краіны. **Нашыя дасягненьні зьяўляюцца вынікам правільнага кіраўніцтва камуністычнае партыі і таму мы, рабочыя, падтрымліваем усе высоўваемыя ёю мерапрыемствы і па ўдарнаму ператвараем іх у жыцьцё, ня гледзячы на сустракаючыяся цяжкасьці, якія зьяўляюцца цяжкасьцямі росту.**

Ад імя ўсіх рабочых нашага заводу шчыра вітаем вас і абяцаем вам поўнае падтрыманьне ў вашай гэраічнай барацьбе, якую вы вядзеце знаходзячыся ў надзвычайна дрэнных умовах. Яшчэ больш мацніце вашу барацьбу супроць капіталістых вашае краіны. Памятайце, што канчатковая перамога за вамі забясьпечана.

Для больш дэталёвага азнаёмленьня з нашым гіганцкім будаўніцтвам і для перакананьня ў нашых посьпехах мы запрашаем вас вылучыць дэлегацыю з вашага рабочага асяродку, якую просьба прысласць да дню сьвяткаваньня Кастрычнікавае рэвалюцыі.

Ад імя рабочых: **Магергут, Багданаў, Рачынскі, Буевіч, Рысін, Мальцын, Лін, Піпкоў, Піскуноў, Рыбіцкі, Загалоўскі, Ершоў, Барадзенін, Кравец, Аронаў, Беленькі, Садовіч, Аўсянікаў, Капялюшнікаў, Пятровіч, Арцем'еў, Якімаў, М., Палякова, Шэршавіцкі, Антаненна, Рагажынскі, Брык, Лабасенка.**

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ

Да рабочых і працоўнага сялянства Зах. Беларусі

Дарагія таварышы!

Некалькі дзён аддзяляе нас ад міжнароднага чырвонага дня—1-га жніўня. Ужо зараз буржуазія ўсяго сьвету, асабліва «вашай» фашысцкай Польшчы, самая агацелая, самая крыважэрная, мабілізуе ўсю паліцыю і фашысцкія арганізацыі, каб у моры крыві патапіць рабочыя дэманстрацыі пратэсту супроць падрыхтоўкі новай крывавай бойні, супроць падрыхтоўкі контрэвалюцыйнага нападу на Савецкі Саюз, дзе нябывалымі ў гісторыі тэмпамі рабочая кляса і працоўнае сялянства пад кіраўніцтвам кампартыі і яе ленінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным будуюць сацыялізм.

Фашысцкая Польшча, як і ўвесь капіталістычны сьвет, задыхаецца ў ціскох гаспадарчага крызису. Польскі фашызм, польскія зубры-памешчыкі ня могуць спакойна глядзець як рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу, прагнаўшы іх, самі, **сваімі ўласнымі рукамі, без дапамогі капіталістаў, будуюць сацыялізм.** Імпэрыялістычная Польшча, як і ўсе сусьветныя імпэрыялістычныя драпежнікі, ня можа пагадзіцца з тым фактам, што тут за мяжою побач знаходзіцца рэспубліка Саветаў, адно існаваньне якое рэвалюцыянізуе працоўныя масы ўсяго сьвету.

І ёсьць з чаго шалець ад злобы імпэрыялістычныя акулы. У той час, як увесь капіталістычны сьвет задыхаецца ад крызису, калі капіталістычная сыстэма руйнуецца, калі капіталізм з галавакружлівай шпаркасьцю ляціць у бяздзьне, а ў фашысцкай Польшчы амаль што другі рабочы беспрацоўны,—тут, у Савецкім Саюзе, а ў тым ліку і ў нашай **БССР, няма беспрацоўя, беспрацоўе ў нас ліквідавана.** Нават больш таго, калі ў вас, у фашысцкай Польшчы, асабліва ў Заходняй Беларусі тысячы кваліфікаваных рабочых—беспрацоўныя і паміраюць з голаду, **у нас не хапае нават чорнарабочых.**

Найлепшым прыкладам таго, што можа зрабіць, чаго можа дасягнуць **пралетарыят сваёй свабоднай працай без капіталістычнай апекі,** працуючы на сябе, а не на эксплёататараў, можа служыць хаця-б наш завод **«Камунар». Наш завод у поўным сэнсе слова — дзіця мастрычціна.** Ён паўстаў з руін былых заводзікаў Якабсона і Ліўшыца і складаўся толькі з аднаго ліцейнага цэху і мізэрнага сьлясарнага, дзе працавала ўсяго толькі некалькі дзесяткаў рабочых, і медналіцейнага заводу Яноўскага. Якая ж спадчына пасьля буржуазіі засталася нам? Што мы атрымалі?

У часе імпэрыялістычнай вайны ўсе машыны з гэтых абодвух заводзікаў былі вывезены або зьнішчаны нямецкімі, а потым і польскімі акупантамі. Ад капіталістычных гаспадароў мы атрымалі напоўразваленыя голыя сьцены. Мы самі гэты завод будавалі, не на замежныя капіталы, а **за свае ўласныя зьберажэньні, на зьберажэньні працоўных Савецкага Саюзу. Намі пабудаваны тры новыя карпусы і зараз будуецца чацьверты**—адзін з вялікарнейшых цэхаў нашага заводу, які будзе **ўвесь механізаваны.** Наш завод да гэтага часу займаў плошчу ў **2,6 гэктараў,** пасьля ж пабудовы новага цэху будзе займаць **4,6 гэктараў.** На нашых вачох рос і вырас гэты завод у досыць буйны варштат сацыялістычнага будаўніцтва. Зараз завод прадстаўляе сабою буйную прамысловую адзінку. На ім **працуе 1.100 рабочых.** Завод выпускае камнядрабілкі, ціскі, сьвідравальныя і бэтоныя варштаты, с.-г. інвэнтар і розныя іншыя машыны для будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі. Прадукцыя заводу ў 1928—29 г. складала 1.711.917 руб., а ў бягучым годзе дасьць 5.890.000 руб. Праца ў нас свабодная, аснаваная на сацыялістычных мэтадах—спаборніцтва і ўдарніцтва. У нас няма 12-14-гадзіннага рабочага дня, што калісьці было пры капіталістых і зараз у вас. Мы ўжо год, як перайшлі **на 7 гадзінны рабочы дзень.**

За два гады пяцігодкі і ва ўдарным квартале, дзякуючы сацыялістычным мэтадам працы—сацспаборніцтву і ўдарніцтву—намі **выкананы і перавыкананы ўсе ноль кавыя і якасныя паказальніки пляну,** за што мы атрымалі адзін з трох пераходных сьцягаў імя ЦК ЛКСМБ. Чэрвеньскі плян бягучага году намі выкананы **на 99 проц.**

Усе гэтыя дасягненьні мы маем дзякуючы сацыялістычным мэтадам працы, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнага калектыву.

Розныя прадажныя пісакі, а таксама сацыял-фашысты і беларускія нацыянал-фашысты, вы чулі ня раз, льлюць мора гразі і хлусьні на Савецкі Саюз, у прыватнасьці на БССР, што ў нас існуе «прымусовая» праца, што рабочаму Савецкаму Саюзу жывецца горш нават чым у капіталістычных краінах, што ў нас «рабскія» ўмовы працы і іншае глупства. Нахай прыедуць вашы прадстаўнікі і дарагія браты да нас у БССР, на наш завод і няхай сваімі ўласнымі вачыма пераканаюцца, што такія ўмовы працы, якія маем зараз мы, **рабочы ня маюць і ў адной капіталістычнай краіне, што такія ўмовы працы могуць быць толькі там, дзе ўлада знаходзіцца ў руках пралетарыяту.** У той час, калі вы працуеце па 12 і больш гадзін у цесных і брудных пакоях, у надзвычай дрэнных антысанітарных умовах, калі з вас выціскаюцца капіталістычнымі драпежнікамі апошнія сокі і вы за сваю 12-14 гадзінную катаржную працу атрымліваеце капейкі,—тут у нас уся ўвага нашай улады накіравана на тое, каб палегчыць фізычную працу чалавека, максымальна замяніць яе тэхнікай.

Але не без труднасьцяй, не самацёкам, не без барацьбы праходзіць у нас праца. Гэту працу трэба было сьпярша арганізаваць. На нашым заводзе ёсьць яшчэ прагульшчыкі, рвачы і розныя падгалоскі апартуністаў. Таму сацбудаўніцтва ў нас адбываецца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Усіх гэтых варожых нам элемэнтаў мы выкрываем, і як пуставельле, выкідваем са сваіх радоў, з радоў будаўнікоў сацыялізму.

На заводзе з 1.100 чалавек на 1-е чэрвеня было **750 ударнікаў.** За першае паўгодзьдзе г. г. **172 ударнікі за ўзорную ўдарную працу, за цэлы рад рацыяналізатарскіх прапаноў прэміраваны.** Побач з ростам заводу, з ростам колькасьці рабочых расьце і партыйная арганізацыя. Зараз на заводзе налічваецца 240 камуністаў і 224 камсамольцы. Камсамольскае ядро нашага заводу талькі за апошнае паўгодзьдзе вырасла на 120 чалавек.

У той час, як у фашысцкай Польшчы, асабліва ў Зах. Беларусі, кожны дзень закрываюцца ўсё новыя і новыя фабрыкі і заводы, у нас растуць усё новыя фабрыкі і заводы, у нас жыцьцё бурліць, б'е крыніцай. У той час, калі ў вас рабочыя ня маюць дзе прылажыць сваёй працы, армія беспрацоўных бязупынна расьце, сотні тысяч беспрацоўных галадаюць—у нас рабочых рук не хапае. Для забесьпячэньня заводу рабочай сілай ужо заключан дагавор з падшэфным калгасам.

Па меры росту эканамічнай магутнасьці нашага Саюзу паляпшаюцца і ўмовы жыцьця рабочае клясы. У нас нашай уладай усё робіцца для таго, каб палепшыць матар'яльнае становішча працоўных мас, каб палепшыць іх дабрабыт. Так, **толькі ў бягучым годзе нашым заводам для забесьпячэньня рабочых кватэрамі будуюцца дамы на 200 кватэр. Мы маем сваю сталоўку, сваю прыгарадную гаспадарку,** дзе мы самі працуем і адкуль забясьпечваем часткова сябе прадуктамі. **Мы маем свой закрыты каапэратыў, свой сьвінарнік.** Для задаваленьня культурных патрэб рабочых заводу мы маем сваю бібліятэку, сваю дзіцячую пляцоўку, **выдаем сваю заводзкую газэту,** будуем свой клюб і для павышэньня кваліфікацыі рабочых, згодна заклі-ку нашага правадыра тав. **Сталіна ў бягучым годзе пры заводзе адкрываецца тэхнікум з 4 гадовым навучаньнем.**

З вялікай увагай і напружаньнем мы сочым за вашай гэраічнай барацьбой супроць улады акупантаў, за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Мы чуем страляніну, чуем енкі катаваных нашых братоў па клясе ў фашысцкіх засьценках і за турэмнымі кратамі. Мы ведаем пра карныя экспэдыцыі польскай паліцэйшчыны на акупаваных вашых землях, мы ведаем аб высылцы ўсіх рэвалюцыйных рабочых і сялян з Зах. Беларусі ў далёкую Паванашчыну. Усё гэта мы чуем і наглядаем ня як староньнія назіральнікі. **Ваша справа—ёсьць наша справа.** Нашы сымпатыі, вашы думкі разам з вамі! Пралетарскае прывітаньне ва-[illegible]-вашай гэраічнай барацьбе с[illegible] фашысцкай дыктатуры!

Ведаеце, дарагія таварыш[illegible] вызваліць вас з пад ярма [illegible] улады, ад барбарскай [illegible] голаду, галечы і жа[illegible] **толькі пралетарская [illegible]цыя,** што шлях да гэтага [illegible] праз Кастрычнік. Дык сьмя[illegible]цы і за[illegible] супроць улады акупантаў і [illegible] будаўніцтва[illegible]каў!

Мы заклікаем вас у міжнар[illegible] чырвоны дзень вышэй узьняць сь[illegible] рэвалюцыйнай барацьбы. **Нахай [illegible] ліцы вёсак, мястэчак і гарадо[illegible] запалаюць чырвоньню сьцягаў [illegible] КПЗБ, пад якімі вы пойдзеце на апошні штурм Фашысцкай дыктатуры за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, за рабоча-сялянскі ўрад, за савецкую Польшчу!**

Гарачае прывітаньне шлем вам у вашай гэраічнай барацьбе. **Мы запрашаем вас прысласць да нас на сьвяткаваньне 14-ай гадавіны кастрычніка сваіх дэлегатаў,** якія навочна пераканаюцца ў тых вялізарных дасягненьнях, якія мы маем дзякуючы дыктатуры пралетарыяту.

Нахай жыве КПП і КПЗБ—арганізатар і кіраўнік працоўных мас у надыходзячых рашаючых баёх за дыктатуру пралетарыяту!

Нахай жыве УсеКП(б) і яе ленінскі ЦК на чале з тав. Сталіным!

У дзень 1-га жніўня ўсе на вуліцы на дэманстрацыю супроць падрыхтоўкі новай сусьветнай бойні, **за абарону першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы—СССР!**

З нецярплівасьцю чакаем прыезду вашай дэлегацыі.

250 подпісаў рабочых «Камунара».

Супроць імпэрыялістычнай вайны

1-е жніўня зьяўляецца Чырвоным днём барацьбы супроць пагрозы новай вайны і падрыхтоўкі нападу на Савецкі саюз. У гэты дзень трэба ўспомніць ва што абыйшлася працоўным усяго сьвету імпэрыялістычная вайна 1914—18 гг. У час вайны было мабілізавана ў армії ваяваўшых дзяржаў да 65 млн. чал., з іх толькі забітых налічваецца больш за 10 млн., ды скалечаных каля 20 млн. Затрачаныя на вайну 420 млрд. залатых рублёў ляглі вялікім цяжарам на плечы працоўных, давёўшы да разарэньня шырокія народныя масы ваюючых краін і калёніяльных народаў.

Імпэрыялістычная вайна 1914—18 гг. «патрасла ўсю сыстэму сусьветнага капіталізму і паклала пачатак пэрыяду яго агульнага крызису». (Праграма Камінтэрну).

Сусьветная буржуазія шукае выхаду з крызису і бачыць гэты выхад... у вайне з СССР. Больш усяго палохае капіталістых нябывалы рост вытворчых сіл нашай краіны і, галоўнае, сацыялістычны характар росту, пры поўнай адсутнасьці беспрацоўя, пры падвышэньні матар'яльнага і культурнага ўзроўня працоўных мас.

Рабочая кляса ўлічыла вопыт імпэрыялістычнай вайны і зараз буржуазіі будзе куды трудней пагнаць на бойню масы працоўных. Усе сэкцыі Камінтэрну няўстанна вядуць работу, адкрываючы вочы працоўным, разаблачаючы сапраўднага вінавайцу як мінулай, так і наступнай вайны. Гэтым вінавайцай зьяўляецца сусьветны імпэрыялізм, у асобе правячай буржуазіі капіталістычных дзяржаў. Здраднікі рабочых, сацыял-фашысты і II інтэрнацыянал, што благаславілі мінулую сусьветную бойню, зараз яшчэ энэргічней удзельнічаюць у падрыхтоўцы да новай вайны супроць Савецкага саюзу. Працэсы шкоднікаў зьяўляюцца бясспрэчным докавам

Наша партыя, Камінтэрн, КІМ і іншыя арганізацыі рабочае клясы вядуць няўстанную барацьбу супроць пагрозы гэтай вайны, супроць пагрозы нападу на бацькаўшчыну працоўных. Інтэрвэнцыя, узброены напад на нас можа перашкодзіць будаўніцтву сацыялізму. Мы змагаемся супроць гэтай небясьпекі, заўсёды імкнемся к мірнаму разьвязаньню ўсіх пытаньняў. Адсюль і нашы прапановы аб раззбраеньні ў Лізе Нацый і наша мірная палітыка з акаляючымі капіталістычнымі дзяржавамі.

Працоўныя СССР і авангард міжнароднага пралетарыяту супроць імпэрыялістычнай вайны, але гэта ня значыць, што яны супроць усялякай вайны. Калі ўціснутыя народы калёній і поўкалёній вядуць вызваленч. вайну супроць імпэрыялізму, калі пралетарыят капіталістычных краін будзе весьці грамадзянскую вайну супроць тых, хто іх уціскае, дык працоўныя за такую вайну.

А таму ўсе сымпатыі працоўных на баку гэраічнай Чырвонай арміі Кітая, якая вядзе барацьбу з кітайскай гамінданаўскай буржуазіяй і з сусьветным імпэрыялізмам, барацьбу за вызваленьне, барацьбу за Савецкі Кітай.

Наша Чырвоная армія, выхоўваемая з посьпехам у духе інтэрнацыяналізму, таксама супроць імпэрыялістычнай вайны, але на тое наша армія і існуе, на то і вучыцца, каб у разе нападу на нас даць ня толькі рашучы адпор сусьветным разбойнікам, але і адбіць надоўга ахвоту зноў нападаць

Што Чырвоная армія гатова к выкананьню гэтай задачы, усе працоўныя пераканаліся ў 1929 годзе, на бліскучых дзеях ОКДВА супроць бела-кітайскіх горазаваяваецеляў.

Нясумненна, буржуазія Захаду шмат чаму навучылася, многае ўлічыла з свайго няўдалага вопыту інтэрвэнцыі краіны Саветаў у мінулым. Яе падрыхтоўка к вайне па якасьці і колькасьці ўзброеных сіл і ваеннай тэхніцы далёка перавышае падрыхтоўку к вайне 1914—1918 г.г. Самым апошнім мерапрыемствам зьяўляецца плян Гувэра, маючы пэўны антысавецкі характар.

Фашысцкія ваенныя арганізацыі маюць сваей задачай умацаваць пагэраічную барацьбу супроць крывавай фашысцкай дыктатуры.

Няхай жыве КПП і КПЗБ, КПГ—арганізатары і кіраўнікі працоўных мас у надыходзячых баёх за дыктатуру пралетарыяту!

Няхай жыве кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва — УсеКП(б) і яе ленінскі ЦК на чале з т. Сталіным!

Няхай жыве гэраічная барацьба працоўных мас Заходняй Беларусі і Нямеччыны!

У міжнародны чырвоны дзень —на вуліцу. Дэманструйце супроць падрыхтоўкі новай сусьветнай бойні!

(Ліст падпісан 200 рабочымі заводу імя Варашылава).

У дзень 1-га жніўня--на вуліцу

Да ўсіх працоўных Заходняй Беларусі, да ўсіх рабочых фабрыкі Лянтэйшнэйдэр Лейпцыгу

(З адозвы рабочых заводу Варашылава)

Рабочыя заводу Варашылава звароце да ўсіх працоўных Заходняй Беларусі і рабочых фабрыкі Лянтэйшнэйдэр Лейпцыгу (Нямеччына) пішуць: «Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе ЦК на чале з тав. Сталіным, мы ўжо ў 1931 г. за пачваем пабудову сацыялістычнай эканомікі ў Савецкім саюзе; цэхі рад рашаючых прадпрыемстваў скончылі свой пяцігадовы план у два з паловай гады. Слухце брать па клясе і крыві, сяне Зах. Беларусі і Лейпцыгу. Цведаеце вы, што рабочая кляса Савецкага саюзу пад кіраўніцтвам ленінскай партыі на чале з т. Сталіным у гэтым трэцім рашаючым годзе пяцігодкі пусціе ў ход 518 фабрык і заводаў, 1040 машына-трактарных станцый. Мы ўжо да гэтага часу маем у эксплёатацыі новых фабрыкі і заводы. Мы ўжо ня з трухлявага, старога коня ў сельскай гаспадарцы перашлі на сталёвага каня—трактар і камбайн.—Мы будуем сацыялізм у нашай краіне, мы выконваем бальшавіцкі пяцігадовы плян у чатыры гады і яшчэ больш шпарка.

„Ваша справа,—заяўляюць рабочыя варашылаўцы,—наша родная кроўная справа. Мы—рабочыя і калгасныя сяляне Савецкай Беларусі як і ўсяго Савецкага саюзу,—ваша ўдарная брыгада.

Рапартуючы аб дасягненьнях пралетарыяту БССР, рабочыя варашылаўцы заклікаюць працоўныя масы Заходняй Беларусі і Нямеччыны дэманстраваць у дзень 1-га жніўня сваю непахісную гатоўнасьць да барацьбы супроць імпэрыялістычных войн, супроць імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі на Савецкі саюз.

«Мы заклікаем вас—у дзень 1 жніўня хай вуліцы гарадоў, мястэч., вёсак убачаць вашы баявыя выступленьні. Выступайце супроць дыктатуры фашызму, супроць налёту імпэрыялістаў на краіну саветаў, за ваша сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Мы горача вітаем вашу

С. Будзённы.

АКУЛЯРНАЯ ФАБРЫКА У ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ ДЗЯРЖАВЕ

З а першае паўгодзьдзе фабрыка недадала прадукцыі на 1 млн. р. Першы месяц 3-га рашаючага к варталу паглыбіў прарыў. Неабходны тэрміновыя меры. Выкрыць брыдкасьці, безгаспадарчасьць

Фабрыка мае ўсе магчымасьці, каб выйсьці з паласы прарываў

Схлябанасьць на акулярнай фабрыцы зрывае прамфінплян

Слова за РСІ і пракуратурай

Віцебская акулярная фабрыка грае вялікую ролю ў справе забесьпячэньня усіх галін прамысловасьці, папярэджваючымі хваробу вока акулярамі. Яна зьяўляецца адзінай у СССР фабрыкай. Вось чаму ўвага ўсіх арганізацый павінна быць накіравана на паўнейшае выкананьне тых плянавых заданьняў, якія дадзены дзяржавай гэтай фабрыцы. Нездавальняючае становішча ўнутры работы самой фабрыкі, недастатковая ўвага адпаведных арганізацый да гэтай маючай вялізарнае значэньне фабрыкі не дае магчымасьці поўнасьцю выявіць і вырваць усё хворае, што маецца на ёй.

Учора мы ўжо адзначалі, што ганебны прарыў у выкананьні прамфінпляну ў значнай меры ствараецца толькі таму, што тут існуе безгаспадарчасьць, абязьлічка.

Невыкананьне фабрыкай плянавага заданьня з кожным месяцам паглыбляецца і носіць пагражальны характар і гэта ў той час, калі фабрыка мае ўсе магчымасьці. Тут ёсьць добрае абсталяваньне, сыравінай фабрыка забясьпечана цалком, так што шукаць прычыны невыкананьня прамфінпляну. прыдзецца не сярод «аб'ектыўных» прычын, а ўнутры самой фабрыкі. Прыводзімыя ў гэтым артыкуле факты яскрава аб гэтым сьведчаць.

Калі ўзяць лічбы выкананьня плянавага заданьня па месяцох, дык стане яскравым, што становішча працы на акулярнай фабрыцы ня толькі не садзейнічае пасьпяховаму руху наперад, а наадварот ствараецца пагроза ганебнага невыкананьня пляну. Вось лічбы: у студзені выкананьне прамфінпляну складала **83,17 проц.**, лютым—**75,98 проц.**, сакавіку—**67,91 проц.**, красавіку—**64,29 проц.**, маі—**60,86 проц.**, чэрвені—**62,25 проц.** Калі разьбіць гэтыя лічбы на кварталы, атрымаецца наступны малюнак: прамфінплян першага квартału выкананы на **75,28 проц.**, а другога—на **62,46 проц.** У сярэднім-жа за паўгодзьдзе плянавае заданьне выкананa на **67,82 проц.**, г. зн. за першае паўгодзьдзе прарыў у выкананьні прамфінпляну сумарна выражацца каля 1 млн. руб.

З 1-га ліпеня цэхі пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Гэты пераводпавінен быў стымуляваць выкананьне прамфінпляну і даць значную эканомію, але гэтага мы ня маем. У той час, калі раней кожны месяц даваў недавыкананьне ў сярэднім на 150 тыс. руб., у ліпені месяцы мы маем яшчэ больш ганебным, нічым не апраўдваемы прарыў. Ва ўмовах поўнага забесьпячэньня сыравінай прамфінплян на ліпень месяц у суме **528 000 руб.** выканан за 25 дзён ліпеня толькі на **57 проц.** і такім чынам дзяржаве у ліпені ня будзе дадана востра дэфіцытнай прадукцыі на суму **227 000 руб.**

Якія ж асноўныя прычыны не даюць фабрыцы выконваць прамфінплян? Іх шмат. У штодзённым жыцьці фабрыкі маюцца недаладкі, безадказнасьць і безгаспадарчасьць, якія стварылі на фабрыцы цяжкую атмасфэру. Тут трудна знайсьці віноватага, суцэльная ўнутрызавадзкая і цэхавая абязьлічка захоўваюць тых шкоднікаў ударнай працы, якія маюцца на фабрыцы. А яны ёсьць. Іх трэба выявіць, зрабіць так, каб кожны адказаў за даручаную яму працу.

На фабрыцы няма дастаткова падрыхтаванага адміністрацыйна тэхнічнага пэрсаналу. У цэхах не адчуваецца партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва. Прадысцыпліна кульгае. Цякучасьць рабсілы вельмі разьвіта. Прагулы дасягнулі вялікіх разьмераў. Рашучая барацьба з гэтымі хворымі зьявішчамі не вядзецца. За першае паўгодзьдзе з-за расхлябанасьці, якая мела месца ў цэхах і дрэннай пастаноўкі тарыфнай работы, ушло з фабрыкі 60 проц. усяго складу рабочых. Ня было пастаўлена на фабрыцы тэхнічнае нармаваньне працы, а таксама і плянавасьць, вынікам чаго стварылася разьбежка паміж зарплатай і прадукцыйнасьцю працы. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва на фабрыцы слаба разгорнута. Няма вучоту і кіраўніцтва ўдарніцкім рухам.

Рабкораўская работа знаходзіцца ў загоне. Ніхто на заметкі не рэагуе, у выніку чаго рабкоры паступова перастаюць пісаць.

Расхлябанасьць, якую стварыла абязьлічка ў цэхах, дае сябе значна адчуваць. Нарэдка можна сустрэць у цэхах у рабочы час групы рабочых, якія займаюцца размовамі. Пры біральня з раніцы да зьмярканьня перапоўнена курцамі. Ёсьць пасобныя рабочыя, якія сыстэматычна там хаваюцца.

Паломка варштатаў і штампаў, псота і прапажа інструмантаў, недапушчальныя адносіны да каштоўнай сыравіны і каляровых мэталяў у цэхах ня зьнішчаюцца. За гэтыя брыдкасьці ніхто не нясе адказнасьці. Не вядзецца ўлік выдаткаваньня гэтых каштоўных матарыялаў. Ёсьць выпадкі прастога шкодніцтва ў скарыстаньні дэфіцытных каляровых мэталяў (золата, срэбра, алюміній, латунь, нікелін і інш.). Гэтыя матарыялы выдаткоўваюцца безкантрольна. Адкіды каляровых мэталяў дасягнулі неймавернай лічбы (каля 50 проц.). Дагэтуль у мусарных скрынках знаходзяцца каляровыя мэталі, якія вывозяцца на звалку. На днях у трубах прыбіральні знойдзены паўфа брыкаты, кінутыя невядома кім.

Паміж цэхамі няма ніякай увязкі ў рабоце. Падрыхтоўчы цэх увесь час зрывае работу зборачнага і цэлулоіднага цэхаў. Мэханічны цэх не спраўляецца з абслугоўваньнем астатніх цэхаў. Шліфавальны цэх дае ўвесь час брак, а тачыльна-рэальны да апошніх дзён на 90 проц. псаваў каштоўнае бемскае шкло.

Ня прымаецца ніякіх мер, каб зьнішчыць гэтую ўнутрыцэхавую неразьбярыху. Тэхкіраўніцтва нядбала на паставіць работу цэхаў на належную вышыню. Матарыялы, абсталяваньне і рабсіла скарыстоўваюцца нерацыянальна. Шмат варштатаў кожную зьмену бязьдзейнічаюць. З боку адміністрацыйна тэхнічнага пэрсаналу ўвесь упор робіцца на работу першай зьмены, астатнія зьмены знаходзяцца часта без усялякага тэхнічна адміністрацыйнага нагляду. Тэхнічнае бюро ня здолела ўвязаць сваю работу з цэхамі і адарвана ад масы рабочых.

Новы трыкутнік фабрыкі ня мае дапамогі з боку астатніх адказных работнікаў. Размовы накшталт такіх, як: **«т. Арэшка на фабрыцы доўга ня ўтрымаецца», «з т. Арэшка і Шалейка работаць нельга», «пры такім намандаваньні яны хутка сабе галаву зламаюць»**—часта можна чуць ад пасобных работнікаў фабрыкі.

Гэтыя варожыя настроі пранікаюць у цэхі, у гушчу рабочых і не знаходзяць належнага адпору з боку партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі фабрыкі. Здаровай самакрытыкі на фабрыцы няма.

Неабходна ўмяшацельства адпаведных вышэйшых партыйных і прафсаюзных арганізацый. Неабходна ўзварушыць усю грамадкасьць фабрыкі, каб дэталёва высьвятліць тых, хто стварае сваёй нядбайнай працай брыдкасьці. Фабрыцы патрэбна цьвёрдае гаспадарчае кіраўніцтва, якое з усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю і настойлівасьцю выкрыла б, пры дапамозе рабочых, усе хваробныя зьявішчы.

Гарком партыі, гарсавет і гарпрафсавет павінны зараз-жа зьвярнуць увагу на недапушчальнае становішча акулярнай фабрыкі, выявіць вінаватых у зрыве плянавага заданьня і прыцягнуць іх да суровай адказнасьці. Фабрыка павінна аўладаць у сваёй штодзённай працы ўдарнымі бальшавіцкімі тэмпамі. Зьнішчыўшы абязьлічку, мабілізаваўшы сілы ўдарнікаў фабрыка будзе здольна ўзяць бальшавіцкі разгон і ў застаўшыйся час выканаць заданьні трэцяга рашаючага году.

І. С.

„Чырвоны мэталіст" можа і павінен выканаць прамфінплян

За апошнія дні ў выкананьні пляну бульбакапалак на заводзе «Чырвоны мэталіст» мы маем некаторы зрух. Так, з 26 па 29 ліпеня выпушчана 82 бульбакапалкі, з іх 26 выпушчана 23, 27—26, 28—33. Лічбы па днёх гавораць за тое, што арганізацыі заводу правялі некаторую работу. Так, за апошнюю пяцідзёнку выкананьне пляну складае 124,12 проц., але на гэтых посьпехах застанаўлівацца ня трэба. Убраць палі трэба машынамі. Завод павінен выканаць свае плянавае заданьне. На сёньняшні дзень на заводзе няма яшчэ дастатковай колькасьці шасьцёрак, што значна тармозіць работу. Далітыя на заводзе «Камінтэрн» шасьцёркі з бронзы ня могуць пакрыць той колькасьці, якая зараз патрэбна. Мэталь бронза зьяўляецца востра-дэфіцітным матарыялам і яе нельга ўжываць на шасьцёркі.

Заводу патрэбен коўкі чыгун. Шасьцёркі з коўкага чыгуну павінен згодна ўмовы высылаць завод імя Энгельса, які доўгі час не дастаўляў патрэбныя шасьцёркі. А здарылася гэта, як зараз высьветлілася, толькі таму, што туды з разанскага заводу Разсельмашам былі высланы няправільныя мадэлі, з прычыны чаго высылаемыя шасьцёркі ўсе бракаваліся. З заводу «Чырвоны мэталіст» была выслана брыгада з 5 асоб на завод Энгельса, якая на працягу 6 тыдняў працавала над вырабам новых і спраўленьнем старых мадэляў і з 25 ліпеня ўжо прыступлена да адліву шасьцёрак, якія павінны прыбыць на завод к 15 жніўня. Гэтакую адцяжку ні ў якім разе нельга дапусьціць. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гораду павінны па-ударнаму падыйсьці да пытаньня забесьпячэньня вёскі неабходным её сельска гаспадарчым інвэнтаром. У застаўшыйся тэрмін трэба мабілізаваць грамадзкасьць на дапамогу заводу выканаць сваё плянавае заданьне, бо з-за адсутнасьці шасьцёрак завод ня зможа пры ўсіх маючыхся магчымасьцях выканаць плян забесьпячэньня сацыялістычнай вёскі адпаведнай колькасьцю машын.

Трэба добра памятаць, што калі мы не дашлём вёсцы патрэбныя ёй сельска-гаспадарчыя прылады, яна ня здолее пасьпяхова правесьці ўборачную кампанію, асабліва пры адсутнасьці патрэбнай колькасьці рабочых.

Побач з выкананьнем пляну бульбакапалак, трэба таксама больш увагі зьвярнуць на выкананьне пляну вырабу іншых машын і прылад. Значны прарыў завод мае па выпуску жмыхадрабілак. Так, за 25 дзён ліпеня замест плянавага заданьня ў 480 жмыхадрабілак заводам выпушчана ўсяго... 34. Па карнярэзках плян выканан на 60,31 процант (трэба 640, выпушчана 386). Тут у значнай ступені недавыкананьне тлумачыцца адсутнасьцю дастатковай колькасьці чыгуннага ліцьця і кваліфікаванай рабсілы (не хапае 80 фармаўшчыкоў).

Неабходна зараз-жа, сапраўды, па-баявому, падрыхтаваць для вёскі машыны і прылады для адказьнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі — уборкі ўраджаю другой бальшавіцкай вясны.

Шыф.

Піўзавод у палоне абязьлічкі і ўраўнілаўкі

На піўзаводзе прамова т. Сталіна яшчэ не знайшла практычнага пераламленьня ў жыцьцё. Тут панує паўнейшая ўраўнілаўка. На зьдзельную аплату працы не пераведзен аніводзін рабочы. Падобныя рабочыя (возчыкі) атрымліваюць куды больш, чым кваліфікаваныя (сьлесары). Абязьлічка маецца на ўсіх вучастках работы. Рабочыя не замацаваны за пэўнымі вучасткамі работы.

Прамфінплян на заводзе ганебна ня выконваецца. За першае паўгодзьдзе плянавае заданьне выканана на 62,88%. Няма ніякага зруху ў выкананьні плянавых заданьняў і ў першы месяц трэцяга рашаючага кварталу. За 25 дзён ліпеня плян выкананан на 58,51 проц. З за адсутнасьці тары ствараюцца часта прастоі. З 12 паступіўшых рабочых прапаноў выканана 10. Прапанова аб пабудове элеватара і падʼёме чаноў не ажыцьцяўляецца.

Неабходна работу заводу пераключыць на ўдарныя рэйкі. Пара ўжо здаць у архіў абязьлічку і ўраўнілаўку—галоўных ворагаў прамфінпляну. Трохкутнік заводу павінен мабілізаваць масы рабочых на хуткае ператварэньне ў жыцьцё баявой дырэктывы, дадзенай т. Сталіным на канфэрэнцыі гаспадарнікаў.

Ш.

Узброіцца тэхнічнымі ведамі і гаспадарчым разрахункам

Шчотачная фабрыка ўвесь час перавыконвае прамфінплян. У трэцім рашаючым квартале лічбы першых чатырох пяцідзёнак гавораць аб тым, што фабрыка будзе здольна і надалей працаваць па-ударнаму, выконваць і перавыконваць свае плянавыя заданьні. Так, за першую пяцідзёнку ліпеня прамфінплян выканан на **100,5** проц., за другую на **111,73** проц., за трэцюю—**128,82** проц. а за чацьвертую на **109,34** проц. Трохкутніку фабрыкі неабходна толькі больш рашуча паставіць пытаньне аб ліквідацыі апартуністычных настрояў аб нямэтазгоднасьці перавесьці цэхі на гаспадарчы разрахунак зараз, а пакаць пакуль фабрыка будзе пераведзена ў нова будуючыйся камбінат. Побач з укараненьнем гаспадарчага разрахунку ў кожны цэх, брыгаду трэба больш укараніць тэхнічныя веды ў гушчы рабочых. Нельга дапускаць такіх выпадкаў, калі тэхнічны гурток пасьля двух заняткаў распаўся з-за няпрыходу кіраўніка. Аўладаўшы гаспадарчым разрахункам і тэхнічнымі ведамі, фабрыка зможа яшчэ больш рашуча рухацца ўперад па перавыкананьні прамфінпляну па колькасных і якасных паказальніках.

Х. Левіт.

Грамадзянскую авіацыю—на службу сацыялістычнага будаўніцтва. Даёш новыя пралетарскія кадры, добры аэрадром грамадзянскай авіацыі

Злачынная безгаспадарчасьць, бясплянавасьць і нядбайная праца ў арцелі „Скрыня"

Да суровай адказнасьці вінаватых

Пр... Пач... ...арцелі **«Скрыня»** віцпрамсаюзу ...гаспадарчага кіраўніцтва. Праў... ...бязьдзейнічае. Нагля... ...ая безгаспадчасьць, бес... ...ь і безадказнасьць з боку ...ая арцелі. У арцелі няма Сёньляну.

Г... некалькі прыкладаў безадказнядбайнай працы гэтай арцелі. ...абленыя **250 бочак** для Белкаапбдгароднінны праляжалі каля месяца ...у на двары, рассохліся і разваліліся, на што праўленьне склала акты, але самае галоўнае ў актах адсутнічае **ня прыказны вінаватых**. Бочкі паступілі ў майстэрню зноў у рамонт.

Другі характэрны прыклад. Выраблены калёсы на суму **10 тыс. р.**, якія ляжаць і «чакаюць» складаньня акта праўленьнем. 28 га ліпеня, невядома для якой мэты ў арцель «Скрыня» сампрамсаюз даслаў воз дубовай фанэры, якая для патрэб арцелі не падыходзіць і ляжыць мёртвым капіталам.

Загадчык вытворчасьцю **т. Ліўшыц** нядбайна забясьпечвае рабочых матарыяламі і яны самі ходзяць па складах і шукаюць патрэбныя ім матарыялы, ужываючы часам у справу дробязныя каштоўныя матарыялы.

Работа, выконваемая брыгадамі, прымаецца толькі праз **3—4 дні**, калі яна бывае ўжо звалена ў адну груду і тады рабочых разьлічваюць «па сярэдняму». Загадчык вытворчасьцю давярае «на слова» членам арцелі, якія яму дакладваюць аб вытвораным рабоце. Якасныя і колькасныя паказальнікі работы брыгад нікім не кантралююцца, нават ня вядзецца адзнака рабочых па табелях. Адзнаку гэтую робяць праз 5—6 дзён кіраўнікі ў сваіх габінэтах, бяручы лічбы са слоў членаў арцелі. Бывае, што рабочыя спазьняюцца на работу, уходзяць раней прызначанага часу і іх працу ніхто ня ўлічвае.

Не зварочваецца ніякая ўвага падрыхтоўцы кадраў, ня ўжываецца тут мэтад брыгаднага вучнёўства. Падлеткі працуюць на чорнай рабоце па двару.

Не вядзецца ніякая работа па арганізацыі і заахвочваньні новых сацыялістычных форм працы. Калі адна з брыгад абвясьціла сябе ўдарнай і ўзяла шэраг канкрэтных абавязкаў, дык яна без падтрыманьня ў хуткім часе распалася.

Загадчык складам **т. Шалкоў** зусім безадказна адносіцца да сваёй працы. На складзе існуе поўны хаос і безгаспадарчасьць. Калі пасобныя члены арцелі рабілі яму заўвагу аб безгаспадарчым хаваньні матарыялаў, дык замест таго, каб зьнішчыць гэта, ён пачынае супаковаць тых членаў арцелі, якія паказваюць на брыдкасьці такімі фразамі, як: **«ладна, папсуецца, складзем акт»**.

Крытыка і самакрытыка ў арцелі ў загоне. Тут яе ня любяць. Калі пасобныя члены арцелі пачынаюць крытыкаваць членаў праўленьня, дык апошнія іх перакідваюць на нізка аплачваемую работу (Станкевіч, Вашчанка). Ніякая культурна-выхаваўчая работа не вядзецца.

РСІ і пракуратура павінны тэрмінова аздаравіць арцель «Скрыня», выкрыць існуючую там безгаспадарчасьць і безадказную працу і вінаватых у нядбайнай працы сурова пакараць.

Шляпакоў.

Уся ўвага Асоавіахэму на садзейнічаньне партыі і ўраду ў выкананьні, перавыкананьні плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі

Пасьпяховым завяршэньнем падпіскі на пазыку „3-га рашаючага" НАНЯСЕМ МОЦНЫ УДАР ПА ПЛЯНАХ ІНТЭРВЭНЦЫЯНІСТЫХ

Гаркамсод працуе дрэнна

Нядаўна «Віцебскі Пралетары» пісаў аб слабай рабоце гаркамсоду, які ня кіруе як сьлед нізавымі камсодамі, што пацьвярджаецца шэрагам фактаў, калі некаторыя камсоды на мясцох зусім бязьдзейнічалі (завод «Чырвоны мэталіст», мэблёвая фабрыка, Старасельскі і Ялагінскі сельсаветы). Гаркамсод заслухоўваў інфармацыі з месц аб ходзе рэалізацыі пазыкі „Трэці рашаючы" нерэгулярна і многія камсоды яшчэ не рабілі сваіх інфармацый.

30-га ліпеня, у зьвязку з правядзеньнем ўдарнага дэкадніка па рэалізацыі пазыкі на вёсцы, было склікана пашыранае паседжаньне гаркамсоду, на якім прадстаўнікі з вёсак павінны былі рабіць інфармацыю аб ходзе ўдарнага дэкадніка. Гэта паседжаньне было сарвана ня толькі з-за няяўкі прадстаўнікоў з месц (сельсаветаў), не зьявіліся таксама і члены гаркамсоду. Гэта яшчэ і яшчэ раз падкрэсьлівае тое, што гаркамсод ня стаў на чале кампаніі па рэалізацыі пазыкі, на чале ўдарнага дэкадніка і нізавыя камісіі садзейнічаньня распаўсюджваньню пазыкі ён не мабілізаваў. Члены гаркамсоду, зьяўляючыяся прадстаўнікамі розных арганізацый і прадпрыемстваў, не дааценьваюць работу гаркамсоду і зрываюць яе, што бязумоўна інакш як апартуністычнай недаацэнкай работы нельга разглядаць.

Гаркому партыі трэба праверыць работу гаркамсоду і вінаватых у зрыве яго працы прыцягнуць да адказнасьці.

Перавыканалі заданьне на 565 %

Калгас «1-га мая», Старасельскага сельсавету, сваё з... не па пазыцы выканаў. За 7 дзён дэкадніка падпіска калгасьнікаў «1-га мая» складае **10.205 руб.**, замест прадджаных заданьнем у **9.640 руб.** Падпіска працягваецца.

Усё-ж у калгасе «1-га мая», хоць і агульнае заданьне выкі перавыканана на 565 руб., але-ж маюцца пасобныя ...леньні калгасу, якія яшчэ сваё заданьне ня выканалі. ...слаба рэалізуецца пазыка сярод аднаасобнікаў.

Усім арганізацыям сельсавету трэба мабілізавацца на ...ны ахоп пазыкай ня толькі калгасьнікаў, але і аднаасоб...

Брыгадзір Галубцоў.

Дабіцца пералому

На працягу некалькіх дзён «Віцебскі Пралетары» піша аб глыбокім прарыве ў рэалізацыі пазыкі на заводзе **«Чырвоны мэталіст»**. Да гэтага часу пералому яшчэ няма. З 1110 рабочых на 27 ліпеня ахоплена падпіскай 994 чал. на суму 87.695 р. пры месячным заробку ў 135.000 р.

Неабходна партыйнай і ...саюзнай арганізацыі заводу, ...місіі садзейнічаньня пр... ...усе захады да выкананьня ...равыкананьня кантрольнага ...даньня і ахопу ўсіх рабочых ...піскай.

Рабкор.

Зварот удзельнікаў тыражу да адстаючых раёнаў

ЧАЛЯБІНСК, 28. Тыраж пазыкі «Пацігодка за чатыры гады» скончыўся. Тыражная камісія і дэлегаты зьвярнуліся да адстаючых раёнаў з наступнай тэлеграмай: «Прадстаўнікі перадавых раёнаў Савецкага Саюзу, сабраўшыяся на трэці ты... рапартуюць аб 100-проц. в... наньні пляну рэалізацыі па... ў сваіх раёнах. Мы, дэле... на тыраж, патрабуем ад в... дэкадны тэрмін скончыць ца... рэалізацыю пазыкі».

Кантрольнае заданьне павінна быць выканана

У Замастоцкім і Машканскім сельсаветах да гэтага часу кампанія па рэалізацыі пазыкі ня была разгорнута. Па Замастоцкаму сельсавету кантрольная лічба ў 17 620 р. ня выканана. У Машканскім сельсавеце пляну рэалізацыі пазыкі зусім ня было да апошняга часу і ніхто ня ведае ў каго знаходзяцца падпісныя лісты. Усё гэта кажа аб тым, што арганізацыі і актыў Замас... кага і Машканскага сельсавета... мабілізаваліся на выкананьне і ...равыкананьне заданьняў.

Трэба кінуць усе сілы на по... выкананьне і перавыкананьне ...рольнага заданьня, з 100-проц. ...пам усіх калгасьнікаў і аднаас... каў.

Жук...

Заданьне недавыканана на 5 проц.

Рабочыя фабрыкі «Прагрэс» праявілі вялікую ініцыятыву ў справе дапамогі вёсцы па рэалізацыі пазыкі і ўзялі на буксір адстаючы Лёзьненскі раён, куды накіравалі свайго брыгадзіра. Гэта вельмі добрая ініцыятыва, якая павінна быць падхоплена ўсімі прадпрыемствамі гораду. Але арганізацыям фабрыкі побач з гэтым неабходна прыняць усе захады да выкананьня заданьня па рэалізацыі пазыкі і сярод рабочых сваёй фабрыкі, якое толькі выканана на 95 проц. Рабочыя фабрыкі „Прагрэс", як першыя адгукнуўшыяся на пастанову гаркому аб узяцьці на буксір адстаючых раёнаў, павінны быць і ў першых шэрагах па рэалізацыі падпіскі на фабрыцы, дабіцца поўнага ахопу ўсіх рабочых і ня менш месячнага заробку.

Рабочы.

Падпіска поўнасьцю аформлена

Дзякуючы добра пр... ведзенай растлумачальна... працы аб значэньні пазы... „Трэцяга рашаючага год... пяцігодкі", Даўжанскі сель... савет дабіўся перавыка... наньня свайго заданьня... рэалізаваўшы пазыку на... суму 12.815 руб. супроц... 11365 р. па пляну, пры... чым калгасны сэктар пе... равыканаў заданьне на... 2700 руб. Падпіска аформ... лена поўнасьцю.

Брыгадзір Пухавіцкі.

Настаўніцтва Шумянскага сельсавету з боку ад падпіскі

Некаторыя настаўнікі **Шумянскага** сельсавету на прапанову старшыні сельсавету дапамагчы ў рэалізацыі пазыкі адказалі: «што нам твая пазыка. Мы ў адпачынку». Асабліва паказала свой твар настаўніца **С доціна**, якая на запытаньне, ці возьме яна пазыку на 100 руб. для распаўсюджваньня сярод сялян аднавала: «к чорту вашу пазыку. Яна нам непатрэбна". Вось характэрны прыклад, як паасобныя настаўнікі сельсавету адносяцца да важнейшай палітычнай кампаніі — рэалізацыі пазыкі.

Інспэктару нарасьветы неабходна на гэта рэагаваць. Такім настаўнікам, як Садоціна, ня месца ў савецкай школе.

Мятла.

Яны ня могуць заставацца на курсах

На курсах сампрамсаюзу апошнім час быў рад клясава-чуждых выдавак. Курсантка **Блен Б.**, падпісаўшыся на пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады», унясла 1 р., а ў час пагашэньня запазычанасьці па пазыцы Блен адмовілася ад унясеньня 4 р., кажучы: «Хай лепш прападзе 1 р., чым 5».

Выявіла свой твар і другая курсантка—**Касаржэўская**. У час падпіскі на пазыку яна заявіла: «Не падпісалася, не падпішуся і нікому ня раю падпісвацца». Адрача таго Касаржэўская агітуе супроць працы ў калгасах, кажучы: «Толькі дурні ідуць у калгас».

Блен і Касаржэўская павінны быць выключаны з курсаў сампрамсаюзу і справа аб іх контрраволюцыйнай вылазцы павінна быць перадана сьледчым арганізацыям.

Вожык.

Супакоіліся

К 1-му ліпеня на фабры... «Праф'итэрн» было ахоп... падпіскай на пазыку 1831 ч... на 100,25 проц. месячнага ...робку і фабрыка за доб... распаўсюджваньне пазыкі і по... ны ахоп рабочых прэміяв... НКФ СССР.

За апошні час на фабры... ўлілося каля 200 рабочых і ф... рычныя арганізацыі сярод іх ...якай растлумачальнай працы ахопе падпіскай новых рабоч... не вядуць, у выніку чаго ...сёньняшні дзень 200 рабочых ...ахоплены падпіскай.

Арганізацыям фабрыкі нез... ходна дабіцца 100-проц. ахо... рабочых падпіскай на пазык...

Вульфсон.

Ніводнага працоўнага Савецкага Саюзу без аблігацыі пазыкі „Трэцяга рашаючага году пяцігодкі".

РУКІ ПРЭЧ АД СССР

(ЛІСТ З ФРАНЦЫІ)

Буржуазныя палітыкі і сацыял-фашысты любяць называць Францыю «міралюбівай краінай». Брыан—па іх словах—гэта «тварэц міра». На ўсе лады на працягу двух год толькі і чуеш, што размовы аб «разбраеньні».

Аднак...

«Сацыялістычны» мэр гораду Рубе пан Леба выступае ў Туры з прамовай аб неабходнасьці «нацыянальнай абароны»... У імя гэтай «нацыянальнай абароны» ён, «левы» сацыял фашыст, як і іншыя сацыял фашысты, усяляка змагаецца за ўзмацненьне ўзбраеньняў капіталістычнай Францыі, узбраеньняў, накіраваных супроць СССР.

Вось некалькі лічбаў, паказваючых шалёную гонку ўзбраеньняў, праводзімую «міратворчаскай» Францыяй.

У 1913 годзе Францыя мела 268 тысячную армію. У 1930 годзе склад армії павялічан да 762 тыс. чал. Рабочыя—тэкстыльшчыкі раёнаў Рубэ, Туркуэна, як і шахцёры басэйна Нор і Па-дэ Кале мелі магчымасьць пераканацца ў тым, што гэтая армія ў мірны час лёгка накіроўваецца супроць «унутранага ворага». Так, на барыкадах Рубэ рабочыя-тэкстыльшчыкі, актыў гэраічнай 120-тысячнай армії забастоўшчыкаў, ткачэй Поўначы, біліся з пешымі і кавалерыйскімі сіламі французкай армії.

Адна з пяхотных дывізій, што знаходзяцца на Поўначы Францыі, налічвала ў 1914 годзе 36 гармат і 24 кулямёты. Тады дывізія ня мела ні танкаў, ні самалётаў, зараз-жа дывізія мае 144 гарматы, 20 танкаў, 30 самалётаў і 113 кулямётаў. Гэтыя данныя, зразумела, ня зусім поўныя. Калі дадаць да гэтага таксама бамбамёты, 37 млм. гарматы, якіх у дывізіі ня менш як 12, дык малюнак будзе яскравы.

У кавалерыйскай дывізіі таксама адбыліся значныя зьмены. У 1914 годзе яна мела 6 кулямётаў і 12 семідзесяцімілімэтровых гармат. Зараз у гэтай дывізіі—134 кулямёта, 315 аўтаматычных „стрэльб", 36 гармат калібра 37 млм. і 22—75 млм. Таксама сюды яшчэ трэба дадаць бранаваныя аўтамабілі і інш.

Францыя мае зараз 30 палкоў танкаў—у кожным палку 130 танкаў, 1.000 чал. асабовага складу, 45 афіцэраў.

Францыя зьяўляецца краінай найбольш разьвітой ваеннай авіацыі. 13 палкоў авіацыі налічваюць да 3-х тысяч самалётаў. Цяжкія самалёты, што таксама ўваходзяць у гэту колькасьць, становяць сабою паветраныя гіганты, перавозячыя 1 тысячу кілё бомб кожны і ўздымаючыяся на вышыню да 5 кілёмэтраў.

Сацыял-фашыст Рэнодэль, сталы дакладчык у парляманце па бюджэту, ня раз двудушна заяўляў, што авіацыя зьяўляецца «зброяй міру". Аднак, у выпадку вайны ўсе грамадзянскія самалёты безадкладна будуць зьменены ў ваенныя і зробяцца машынамі сьмерці. Недарма «Журналь Офісьель» у нумары ад 20 га красавіка 1930 г. папярэджвае прыватныя фірмы, купляючыя самалёты, што яны ў разе вайны павінны будуць здаць гэтыя самалёты ў распараджэньне ваеннага міністэрства.

Мілітарыстычная Францыя, аднак, не задавольваецца лікаманкавым самаўзбраеньнем. Яна з той жа пасьпешнасьцю ўзбройвае свае маленькія «васальныя» дзяржавы на мяжы СССР—Румынію, Польшчу, Юга-Славію, Прыбальтыцкія краіны—лімітрофы.

Рабочыя мэталісты заводу «Кэл» у Дэнене навочна бачуць, што бесьперапынна выпускаемыя заводам 37-млм. гарматы перавозяцца таксама бесьперапынна з Францыі ў Польшчу. Польска-румынская ваенная ягода, накіраваная супроць СССР, аднаўлена ў студзені г. г.

3.000.000.000 лей (лея—1 кап), атрыманыя ў выглядзе пазык з Францыі, Румынія ўплаціла за ваеннае ўзбраеньне заводам «Шкода» у Чэхаславакіі. На французскія грошы Румынія будуе рад ваенных заводаў каля Бухарэста, 200 тысячная армія Румыніі на французскія грошы забясьпечваецца самалётамі, прычым на тыя-ж грошы ў Браск будуецца авіазавод на 300 самалётаў штогодна. Заводы «французскага гарматнага караля» Крэзо на французскія сродкі ў тэрміновым парадку заканчваюць 45 артылерыйскіх батарэй для Румыніі. Да 20.000.000.000 франкаў (франк 7 кап.) падрыгнуў французскі ваенны бюджэт. І гэта на вачох дзесяткаў тысяч беспрацоўных тэксьцільшчыкаў Рубэ, мэталістаў Ліля, докераў Дзюнкірха, шахцёраў Нор і Па-дэ-Калэ, якія не атрымліваюць ні сантыма (дробная манета каля адной дзесятай часьці капейкі) дапамогі.

М

6-га ліпеня сацыял-фашысцкая газэта паўночы Францыі «Журналь дэ Рубэ» піша:

«Кіруючыя колы Нямеччыны ўмелі жылі свае заклікі к мудрасьці нямецкага народу, але яны працягваюць свае супрацоўніцтва з неспакойнымі элемэнтамі, вельмі небясьпечнымі для эўрапейскага міру...»

Аб якіх «неспакойных элемэнтах» піша гэта газэта? Напэўна, не аб нацыянал-фашыстых тыпу Гітлера—гутарка ідзе, зразумела, аб СССР. Гэтая газэта спрабуе стварыць ілюзію, што «СССР зьяўляецца ворагам міра». Міратворцы-ж гэта тыя, хто штодзень прапаведуе вайну супроць СССР і супроць так ненавіснай эўрапейскай буржуазіі савецкай пяцігодкі.

Небясьпека нападу на СССР становіцца ўсё больш яснай. У дзень 1-га жніўня рабочыя Поўначы Францыі, рабочыя цэнтральных і паўднёвых раёнаў краіны пакажуць капіталістым і іх паўным псам—сацыял-фашыстым, што ў іх ужо ёсьць раз прынятае цьвёрдае рашэньне—не дапусьціць нападу на Савецкі саюз. Тысячы і дзесяткі тысяч французскіх рабочых выйдуць у гэты дзень на маніфэстацыю пад сьцягамі французскай камуністычнай партыі.

Рукі прэч ад СССР?

Рыв.

УДАРНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ, НАРЫХТОВАК І ВОСЕННАЙ СЯЎБЫ

БУДЗЕ НА ІЫМ АДКАЗАМ НА ВАЕННЫЯ МАХІНАЦЫІ ІМПЭРЫЯ СТЫХ

Пачалося жніво па калгасах Віцебскага раёну

Ніводнай хвіліны прастою. Правільна расставіць сілы

Па ўсіх калгасах і аднаасобным сэктары Віцебскага раёну пачалося жніво. Калгаснікі праяўляюць у працы ўдарныя тэмпы, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Некаторыя калгасы жніво скончаць праз некалькі дзён: калгас «Вялікі шлях», В-Лётчанскага сельсавету. Калгас «Чырвоны чыгуначнік», Сялюцкага сельсавету, выканаў жніво на 70 проц. Калгас МОПР таго-ж сельсавету—на 55,6 проц.

Побач з гэтым у некаторых калгасах мы маем прарывы. У камуне «Іскра Леніна», Шумнянскага сельсавету, жніво выканана толькі на 15—18 проц. Да гэтага часу ў камуне не праполана 7—8 га гародніны, ня скошана сенажаці на 40 проц., заданьне па сілосу—450 тон, закладзена толькі 10—12 тон. Калгас «Пяцігодка—у чатыры гады», Шумнянскага сельсавету, таксама марудна разгортвае жніво. Старшыня калгасу ў зьвязку з некаторым недахопам рабочай сілы апусьціў рукі. Яго ахапілі дэмабілізацыйныя настроі. Замест разгортваньня бальшавіцкіх ударных тэмпаў работы, мабілізацыі калгасных мас, ён перашкаджае ў працы сваім хныканьнем і ныцьцём.

Ныцікам і малаверам ня месца ў нашых шэрагах.

Усе калгасы павінны ўзяць на грамадзкі буксір калгасы «Іскра Леніна» і «Пяцігодка—у чатыры гады», каб дапамагчы ім выйсьці з паласы прарываў.

Ніводнага калгасу, не ўключыўшагася ва ўборачную эстафэту саветаў.

В.

Калгас імя т. Сталіна скончыў сенауборку і прыступіў да жніва

Калгас імя т. Сталіна, Астровенскага сельсавету, 22 ліпеня скончыў сенажаць і прыступіў да жніва. Калгаснікі завяраюць, што яны з такім жа посьпехам будуць праводзіць і ўсю далейшую працу па калгасу.

Характэрна адзначыць вялікую праробленую калгасам працу ў нарыхтоўцы леса. Арганізаваны калгасам вас-крэсьнік на лесанарыхтоўках уцягнуў у гэтую працу ўвесь астровенскі актыў. Калгаснікі абвясьцілі сябе мабілізаванымі на два дні і ў выніку нарыхтавалі лесу звыш 1 тыс. кубамэтраў. Калгас імя т. Сталіна выканае свае абавязкі па дагавору з рабочымі абутковай фабрыкі імя Лекерта і забясьпечыць іх апалам.

Праца калгасу імя т. Сталіна павінна служыць прыкладам для ўсіх астатніх калгасаў.

Брыгадзір.

Толькі 103 калгасы на зьдзельшчыне

Арганізаваць дэкаднік сіласаваньня

Пастанова бюро ЦК партыі Беларусі аб ходзе ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да восеннай сяўбы з усёй чоткасьцю і бальшавіцкай выразнасьцю сыгналізуе аб вялікіх прарывах на фронце ўборкі ўраджаю.

— Асабліва ў кепскім становішчы знаходзіцца справа з практычным ажыцьцяўленьнем зьдзельшчыны ў калгасах і з падрыхтоўчай работай да разьмеркаваньня ўраджаю (затрымка з выдачай працоўных кніжак, усё яшче нездавальняючая пастаноўка ўліку, запісу адработаных дзён і г. д.).

Так гаворыцца ў пастанове ЦК.

Гэтае азначэньне, як нельга лепш датычыцца мясцовых арганізацый Віцебскага раёну і ў першую чаргу райкалгасаюзу і калгасаў. Ня гледзячы на шэраг прынятых мер па ўвядзеньні зьдзельшчыны належнага мы яшчэ не дасягнулі. **Па раёну лічыцца 147 калгасаў, а на зьдзельшчыну перайшло толькі 103 калгасы,** прычым і гэтую лічбу надзвычайна цяжка абгрунтаваць, бо частка калгасаў хоць і прыняла зьдзельшчыну, але яе ня ўжывае.

Як нам паведамілі з райкалгасаюзу, працоўнымі кніжкамі забясьпечаны ўсе калгасы. У той-жа час калгасамі гэтыя кніжкі да кожнага калгасьніка не даведзены. Кніжкі дзесьці ляжаць у сталох і няма ведама чаго чакаюць. У той час, як трэба было скончыць ужо запіс працадзён калгасьнікаў за час вясновага севу, частка калгасаў гэтага не зрабіла, што бязумоўна ня можа забясьпечыць правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў.

Мы зараз сталі пад наяўнай пагрозай **зрыву сіласаваньня.** Пастанова ЦК партыі гаворыць: **Да 1-га верасьня засіласаваць ня менш 65 проц. пляну і да 1 га кастрычніка на 100 проц.** Тэмпы сіласаваньня, якія маюцца ў нас зараз (каля 11 проц. выкананьня пляну) ані ў якім разе не забясьпечваюць правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК партыі. Сенаўборачная таксама зацягнулася. Асноўная прычына крыецца ў няўменьні правільна раставіць сілы, у надзеях на самацёк, у тым, што зьдзельшчына не ваўсіх калгасах знайшла ўжываньне. Усё гэта патрабуе тэрміновай ліквідацыі, зьнішчэньня недахопаў на ходу. **Мы высоўваем прапанову арганізаваць дэкаднік штурму сіласаваньня. У кожным калгасе стварыць сілосную брыгаду, ініцыятыву гэтага дэкадніка павінен узяць на сяре гарком камсамолу і камсамольскія ячэйкі. У час дэкадніка арганізаваць спэцыяльныя суботнікі па кампаньні ям, траншэй і рамонту мінулагодніх ям. Для дапамогі калгасам камсамольскія ячэйкі гораду павінны выслаць свае брыгады для ўдзелу ў дэкадніку і правядзеньня суботніку.**

У нас ёсьць усе магчымасьці, каб выканаць пляны сенаўборкі, сіласаваньня, каб укараніць зьдзельшчыну. Патрэбны толькі настойлівая бальшавіцкая ўпартасьць, сапраўды арганізатарская работа.

Калгасы Міхалёўскага сельсавету ўключыліся ва ўборачную эстафэту

Рыхтавацца да церабленьня лёну

У Міхалёўскім сельсавеце налічваецца 15 калгасаў. Яны аб'яднаюць 344 гаспадаркі. Найбольш буйныя калгасы «Новы сьвет» і імя Варашылава, якія аб'яднаюць кожны па 45—46 гаспадарак.

Зараз усе калгасы адчуваюць востры недахоп у рабочай сіле. Справа ў тым, што добрыя кліматычныя ўмовы выклікалі шпаркі рост пасеву: ячмень пасьпеў адначасова з жытам, а ў іншых мясцох і яшчэ раней. У той-жа час патрэбна ўзьняць і папар. На ўсё гэта не хапае рабочых рук. Калгасам Міхалёўскага сельсавету патрэбна тэрміновая дапамога гораду, шэфствуючых прадпрыемстваў. Побач з гэтым трэба адзначыць, што калгасы ня могуць цалком скарыстаць жаночую сілу. З 15 калгасаў толькі ў адным ёсьць дзіцячая пляцоўка, у іншых няма ні пляцовак, ні ясьляў. Райспажыўсаюзу і райкалгасаюзу трэба тэрмінова паклапаціцца аб адкрыцьці ў некаторых калгасах часовых ясьляў.

Сіласаваньне кармоў знаходзіцца пад прамой пагрозай зрыву. Па пляну па калгасах трэба засіласаваць 450 тон сілоснай масы, а плян выканан толькі на 5 тон. Маецца адна яма. Дрэнна таксама з уборачнымі машынамі. Па сельсавету маецца адна касілка і 4 жнеяркі. У восенную сяўбу будзе адчувацца недахоп лемяхоў. Плян засеву лёну выканан на 200 проц. Зараз надыходзіць час церабленьня яго. Калгасы Міхалёўскага сельсавету, якія з посьпехам справіліся з пасевам лёну, павінны зараз-жа ўзяцца за падрыхтоўку да церабленьня.

На адбыўшымся 28-га ліпеня сходзе актыву Міхалёўскага сельсавету, калгасы ўсе ўключыліся ва ўсесаюзную ўборачную эстафету саветаў. З свайго боку сход актыву высунуў сустрэчную лічбу па калектывізацыі—замест 76 проц. калектывізаваць на 80.

На выклік калгасу Клім Варашылаў адгукнуліся астатнія калгасы і абяцалі ўдарнымі тэмпамі правесьці ўборачную, аднаасова рыхтуючыся да восеннай пасеўнай кампаніі.

Белеьні.

На фронце сенанарыхтовак працягваецца маруднасьць

Такога ўраджаю сена і такога надвор'я ў час уборкі, як у гэтым годзе, трэба чакаць доўгімі гадамі. Здавалася-б, што ў зьвязку з гэтым нарыхтоўчыя арганізацыі, а па нашаму Віцебскаму раёну адзіным нарыхтоўшчыкам сена ў гэтым годзе зьяўляецца райспажыўсаюз,—павінны былі скарыстаць усе магчымасьці, надаць максымум увагі гэтае справы, каб гэтым самым наблізіць разьвязаньне партыяй і ўрадам праблемы жывёлагадоўлі.

Але ж на справе атрымліваецца наадварот. Папяровая пісаніна заядае наш нарыхтоўчы апарат. Загадчык нарыхтоўчым сэктарам райспажыўсаюзу т. **Стальмакоў** увесь патануў у паперах, з за якіх зусім ня відаць жывой справы. Ён кажа, што нарыхтоўка сена праходзіць вельмі добра. На ўчарашні дзень, 30 га ліпеня, нарыхтавана сена каля 800—900 тон. Учора паведамілі па тэлефону з Рудакоўскага сельсавету аб нарыхтоўцы 100 тон сена, але ж бяда ў тым, што з за адсутнасьці нарадаў, нельга адгружаць сена і яно працягвае ляжаць на мясцох у здатчыкаў.

У гэты самы час у Стальмакова каля 2 х тыдняў ляжаць нарады віцебскага аддзяленьня саюзрамкорму на 325 тон для часьцей Чырвонай армії, па якіх ён выканаў на сёньня толькі 45 тон. Як гэта назваць? Адсутнічаньнем нарадаў ці няўмелай работай, таптаньнем на месцы? Кожнаму яскрава, а Стальмакоў дагэтуль, як быццам, гэтага не ўразумеў. Коні ўсіх транспартных арганізацый часьцей Чырвонай армії працягваюць харчавацца мінулагоднім пыльным сенам, а Стальмакоў разьвязвае праблему жывёлагадоўлі «па-Стальмакоўску». Няма нараду і больш нічога—мая справа маленькая.

Тэрмін здачы кулацтвам сена па цьвёрдых заданьнях 5 га жніўня. Кулак разбазарвае сена. Ён цягне на прыватны рынак, а кааперацыю імкнецца ашукаць, здаючы недабраякаснае сена. Такія выпадкі мы маем па Віцебску, Гарадку і іншых мясцох, дзе прышлося зьвярнуць назад больш 100 вазоў сена. Вораг не сьпіць. Ён працягвае сваю шкодніцкую работу. Сена ўплывае, а Стальмакоў чакае нарадаў.

У гэтым годзе па ўраджаі магчыма ня толькі выканаць плян па сенанарыхтоўках, але і перавыканаць са значным перавышэньнем. Гэта ўясьнілі сабе амаль усе раёны (Гарадоцкі раён замест прызначаных па пляну 2500 тон сена, бярэцца нарыхтаваць каля 5000 тон), улічваючы, што па папярэдніх меркаваньнях плян нарыхтоўкі саломы поўнасьцю выканан ня будзе.

Трэба адзначыць, што з дасылкай нарадаў на сена і салому на прылічаючыяся з агульнай колькасьці 1600 тон Белкаапсаюзу 1100 тон сена, Белкаапсаюз таксама марудзіць. Ён своечасова не паклапаціўся даслаць нарады, якіх і да гэтага часу няма, ня гледзячы на дасланую яму 28 ліпеня тэлеграму аб высылцы нарадаў. Гэтай маруднасьцю Белкаапсаюз заразіў усю сваю сыстэму—нізоўку, а Стальмакоў трымае на гэта конкурс.

Трэба рашуча ўдарыць па гэтакай маруднасьці, «па-Стальмакоўскіх» тэмпах. Плян сенанарыхтовак павінен быць ня толькі выканан, але і перавыканан. Самацёку ня месца ў нашай працы. Мы—за бальшавіцкія ўдарныя тэмпы.

Чырвоныя абозы шырокіх калгасных мас зьмятуць гэты самацёк, гэту маруднасьць на сваім шляху.

Валдай.

Ліквідаваць прарывы

Выдрэйскі сельсавет уключыўся ў месячнік

У калгасах Выдрэйскага сельсавету з сенаўборкай справы ня зусім добрыя. З-за няправільнай арганізацыі працы ганебна адстаюць калгасы «Бальшавік» і «Перамога», якія да гэтага часу сенаўборку яшчэ ня скончылі. Ня лепш і з уборкай сенажаці.

Балючае месца ў працы калгасаў—сіласаваньне. У некаторых калгасах, як „Сацбацькаўшчына" выры ты толькі ямы. З боку сельсавету праяўляецца яўна праваапартуністычная недаацэнка сіласаваньня. Пляны, дасланыя РВК, да паасобных калгасаў не даведзены.

27 ліпеня сельсавет уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі. Пры сельсавеце створан штаб з трох асоб, увесь актыў разьбіт на брыгады, якія прымацаваны да калгасаў. Трэба спадзявацца, што ў бліжэйшыя дні наступіць пералом.

Пав. Хадарэнка.

Зялёныя шкоднікі атакуюць гароды

Адразу-ж мабілізавацца на барацьбу з імі

За апошнія дні з раёнаў, калгасаў і саўгасаў сталі паступаць трывожныя зьвесткі аб паяўленьні зялёных шкоднікаў на кармавых і гародніх культурах. Шкоднікамі на 29 ліпеня ахоплена ўжо каля 150 га, з якіх каля 100 га ў прыгарадных гаспадарках ЦРК. Галоўнымі шкоднікамі, зьнішчаючымі ўраджай, зьяўляюцца: вусені рапсовага пілільшчыка і капусныя бялянкі. Вусені пілільшчыка гразна-зялёнага колеру з глыбокімі папярэчнымі маршчынамі і ўсьцяж сьпіны цягнуцца 3 чарнаватыя палоскі, якія часам зьліваюцца паміж сабою. Галоўка маленькая, чорная, ніз цела больш сьветлы, ног мае 22. Вусені бяляна капуснага сьветла-зялёнага колеру з чорнымі кропкамі і жоўтымі палоскамі па бакох і сьпіне. Вусені, як рапсовага пілільшчыка, так і бяляна капуснага шкодзяць амаль усім крыжыковым расьлінам, як турнэпс, бручка, капуста і інш. Шкоднікі, паяўляючыся на культурах, галоўным чынам пара жаюць зялёныя часткі расьлін, гэта значыць тое, чым жыве і пітаецца расьліна. А раз зьнішчаюцца галоўныя органы расьліны, значыць можа загінуць і сама культура. Шкоднікі настолькі энэргічна праводзяць сваю працу па згубе расьлін, што на працягу некалькіх дзён могуць зьнішчыць і ўвесь ураджай. Барацьба з імі павінна быць таксама энэргічная. Пры масавым іх паяўленьні на барацьбу са шкоднікамі павінна быць прыцягнута ўся грамадзкасьць, галоўным чынам ячэйкі ТДА-Авіахэму, ЛКСМ, піанэры, школьнікі і ўся грамадзкасьць.

Барацьба са шкоднікамі можа быць наступная:

Мэханічнае зьнішчэньне, збор рукамі, устрахіваньне, раздушваньне яек і вусеняў. Для гэтай мэты патрэбна арганізоўваць спэцыяльныя атрады, апрыскваньне і апыльваньне расьлін атрутамі.

Віцебская машынна-зьнішчальная станцыя і віцебскі гарсавет ТДА-Авіахэму заклікаюць рабочых саўгасаў, калгаснікаў, камсамольскія ячэйкі, піанэраў, вучняў прыняць шырокі ўдзел у барацьбе са шкоднікамі, не даць ім зьнішчыць сацыялістычны ўраджай.

Н-скій Чырвонаштандарнай ударнай Омскай дывізіі

У ДЗЕНЬ ЯЕ СЛАЎНАГА 13-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ

АД ПРАЛЕТАРЫЯТУ І КАЛГАСЬНІКАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ — ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬЕ

18 сьцягаў ЦВК, 898 ордэнаў Чырвонага сьцягу, гэраічныя перамогі на ўсіх франтох—баявы шлях байцоў і начскладу омцаў

Да 13-га юбілею падыходзім з вялікімі дасягненьнямі

Н-ая чырвонаштандарная ўдарная дывізія сьвяткуе 13-ы юбілей свайго існаваньня. 13 год нясупыннай работы і барацьбы пад сьцягам Леніна за справу пралетарскай рэвалюцыі, за справу ўзмацненьня баявой магутнасьці, вартаўніка дыктатуры пралетарыяту — рабоча сялянскай Чырвонай арміі. Шмат гэраічных старонак упісала дывізія ў баявую гісторыю Чырвонай арміі. Праз горы Уралу, тайгу Сібіры, палі Беларусі, па льдох Фінскага заліву, па неабсяжных стэпах Паволжа Н-я высока пранесла сьцяг перамогі над ворагамі пралетарскае рэвалюцыі, усюды распаўсюджваючы ідэі рабочых і сялян, ідэі ленінскай партыі бальшавікоў, усюды руйнуючы белагвардзейшчыну, бандытызм. За чатыры гады сваёй баявой работы омцы ўзялі ў палон 85.186 салдат і афіцэраў, захапілі 2269 кулямётаў, 353 гарматы, 15 бронецягнікоў, 10 бронеаўтамабіляў, 333 паравозы, 12235 вагонаў, 100 тысяч вінтовак, 3.500.000 снарадаў, 12 млн. патронаў і шмат іншай ваеннай маёмасьці.

Дывізія за сваю баявую работу атрымала 18 сьцягаў ЦВК і Сібрэўкому, 898 ордэнаў чырвонага сьцягу. Вось славуты шлях Чырвонаштандарнай Омскай ударнай.

Зараз маладыя омцы, памятуючы баявыя традыцыі сваіх старэйшых братоў па клясе, шырока ўжываючы мэтады і сацспаборніцтва і ўдарніцтва, няўстанна працуюць над выкананьнем і перавыкананьнем плянаў ваенна-палітычнай вучобы. Вось паказальнікі, з якімі мы прыходзім да нашага сьвята. Наша партарганізацыя як ніколі моцна згуртавана вакол ленінскага ЦК, нястанна змагаецца за правільнае сапраўднае бальшавіцкае правядзеньне генэральнай лініі партыі. Хныканьне, асобныя апартуністычныя выступленьні і настроі атрымліваюць магутны адпор. Мы ўжо маем ня мала посьпехаў на фронце выкананьня рашэньняў усеармейскай нарады сакратароў парт'ячэек, мы адзначаем узросшую адказнасьць камуністых за сваю працу, за працы сваіх падразьдзяленьняў. Камуністы і камсамольцы ў асноўным зьяўляюцца ўзорам, аб чым сьведчаць стрэльбы, калі камуністы і камсамольцы далі на 10 і больш проц. агульнага выкананьня, калі на тактычнай вучобе камуністыя і камсамольцы паказваюць сапраўдныя ўзоры гэраічнай работы, з бальшавіцкай упартасьцю перамагаючы цяжкасьці. Гэты прыклад заражае і беспартыйных, лепшыя з якіх бесьпераапынным патокам **ідуць у партыю Леніна і ў ленінскі камсамол.**

За апошні год прынята ў партыю **да 1200 чал.** і ў шэрагі **КСМ 673 ч.** і забясьпечан 60 проц. партыйна-камсамольскі склад частак. Дасягненьні ў перабудове работы забясьпечылі добрае выкананьне стрэльб з вінтовак у Н палку, пярШынство артылерыстаў дывізіі за пярыяд лягэрнага збору і забясьпечылі пасьпяховасьць выкананьня асноўных заданьняў партыі.

Вось лічбы перамог:

Мы павялічылі шэрагі калгасьнікаў сярод байцоў і начскладу. Зараз у нас калектывізавана: у Н-м стралковым палку чырвонаармейцаў **26 проц.**, мл. начскладу **39 проц.**, сярэдн. начскладу **35 проц.**, Н-м стралковым палку — чырвонаармейцаў **55 проц.**, мл. начскладу **48 проц.** і сярэдняга камандзнага складу **43 проц.**, у Н-м артылерыйскім палку — чырвонаармейцаў **55 проц.**, мл. начскладу **66 проц.** сяр. начскладу **57 проц.**

Камуністыя і камсамольцы ка... тывізавалі гаспадаркі сваіх сямей... 90—95 проц., а ў асобных арган... цыях на 100 проц.

На пазыку «Трэці рашаючы г... далі каля 300 тысяч руб. і падпі... працягваецца з непаслабным эн... зіямам. Па вярбоўцы... звыштэрміновую службу больш... частка ўжо перавыкана... кантрольную лічбу: Н-скі стр. полк... **100 проц., Н-скі арт. полк... 100 проц.** і **кав. эскадрон... 100 проц., рота сувязі на 158 проц... сап. батальён на 122 проц., Н-... артдзіў—167 проц.**

Зараз са зьверхсрочнікамі разгор... ваецца ўзмацнёная работа па п... вышэньні іх ваенна-палітычнага ... роўню.

Варашылаўскі суботнік пра... шоў з вялікім энтузіязмам, ба... цы і начсклад паказалі сапраўдн... ўзор работы на сацыялістычных ... лёх, значна перавыканаўшы норм... установленыя для калгаснікаў. Во... лічбовыя вынікі за апошні пэры... нашай работы к дывізійнаму сьвят... Недахопы зьнішчым.

Наш шлях усеян ня толькі адны... дасягненьнямі. Мы маем шэраг бу... нейшых недахопаў, аб якіх з ба... шавіцкай адкравенасьцю гаварылі ... перавыбарчых сходах партыйных ... камсамольскіх органаў.

Згуртаваныя вакол ленінскай па... ты, працуючы на аснове яе ген... ральнай лініі, у бязьлітаснай барач... бе з апартунізмам, з поўным раз... меньнем сваіх задач—мы ўступаем ... 14-ты год.

Бейлін.

Захаваем пярШынство

Да дню 13-й гадавіны дывізіі артылерысты-омцы скончылі артылерыйскі збор. Байцы і начсклад артпалка омцаў, выходзячы ў лягэр для праходжаньня артылерыйскага збору, узялі на сябе абавязкі па якасным выкананьні пляну па абароне і палітычнай падрыхтоўцы.

Праведзеныя батарэйныя, дывізійныя і групавыя стрэльбы паказалі, што омцы выконваюць узятыя на сябе абавязкі (проц. выкананьня 93,7). У пярыяд праводзімых стрэльб арудзійны разьлік хутка і точна вытвараў сваю работу на агнявых пазіцыях і хутка па камандах даваў належныя тэмпы агня. Разьведчыкі правільна выбіралі агнявыя пазіцыі, наглядальныя пункты умела вялі нагляд за полем боя, хутка і точна работалі з прыборамі для нагляду. Ездавыя і разьведчыкі за пярыяд збору здолелі захаваць конскі склад і сваімі сумленнымі адносінамі да каня забясьпечвалі хуткасьць манэўранасьці батарэй, дывізіёнаў і палка ў цэлым. Сувязістыя навучыліся хутка пракладваць сувязь і набылі дасгатковы вопыт нясеньня службы ў апараце.

Камандны склад за пярыяд збору шырока папоўніў свае веды па артылерыйска-стралковай падрыхтоўцы і па рабоце з часткамі пяхоты. Асабовы склад артылерыйцаў-омцаў значна папоўніў свае палітычныя веды і на практыцы, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, праводзіў іх у жыцьцё. За пярыяд зімовай вучобы і пярыяд збору **161 лепшых ударнікаў з чырвонаармейскага і камандзнага складу ўступілі ў шэрагі ленінскай партыі і камсамолу. 46 проц. асабовага складу, маючага сувязь з сельскай гаспадаркай, уступілі ў калгасы. 33 тысячы руб.** артылерыйскія омцы далі па падпісцы на пазыку «Трэці рашаючы год пяцігодкі».

Артылерысты-омцы ўсямерна ўмацоўвалі дысцыпліну на ўсіх вучастках сваёй вучобы, работалі бальшавіцкімі мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Скончыўшы збор, артылерысты ўчынілі 110-клм. пераход. У пярыяд паходу байцы і начсклад захавалі поўную баяздольнасьць свае сілы для прадстаячай вучобы з часткамі нашай слаўнай Чырвонаштандарнай дывізіі. Захоўваючы ўзорны парадак у час паходу, байцы адказалі ўзорным захаваньнем матар'яльнай часткі, ручной зброі, конскага складу і ўзорна вялі сябе сярод мясцовага насельніцтва калгаснікаў і аднаасобнікаў. Байцы і начсклад штодзённа тлумачылі калгаснікам і аднаасобнікам рашэньні нашай партыі **47 ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў партыю і камсамол. 38 чал. байцоў і малодшага камскладу падалі заявы аб прыёме іх з сем'ямі ў калгасы па месцы жыхарства.**

Аддаючы ўсе сілы і энэргію на ўмацаваньне баяздольнасьці палка, артылерысты омцы ўмацоўваюць слаўныя баявыя традыцыі Чырвонаштандарнай імя італьянскага пралетарыяту дывізіі і не здаюць свайго пярШынства і тэмпаў баявой падрыхтоўкі.

Саўткін.

Ленінградцы мацуюць слаўныя традыцыі Омскай

У бойках з клясавымі ворагамі, за пралетарскую дыктатуру—Ленінградзкі полк мае слаўныя баявыя подвігі. У дзень сьвяткаваньня 13-га юбілею, ленінградцы высока трымаюць сьцяг ударнага палка. Штодзённая баявая вучоба, яе сапраўды ўдарныя тэмпы даюць упэўненасьць, **што былыя баявыя паслугі і традыцыі за ленінградзкім палком застануцца і будуць мацнець.** Пад кіраўніцтвам партарганізацыі і начальствуючага складу, пры шырока разгорнутым сацспаборніцтве і ўдарніцтве полк на працягу ўсіх гадоў меў пярШынства па баявой падрыхтоўцы сярод часьцей дывізіі. На працягу зімовага пэрыяду напружанай работы ўсяго складу палка, ён заваяваў па стралковай падрыхтоўцы першае месца ў акрузе.

К 13-му юбілею палка мы маем вялікія дасягненьні ў вывучэньні баявой тэхнікі, мы аўладаем вышэйшымі складанымі формамі бою, цьвёрда праводзячы генэральную лінію партыі. Ленінградцы падпісаліся на пазыку «Трэці рашаючы год пяцігодкі» на 48.500 руб., уключыліся ва ўсесаюзны Варашылаўскі суботнік па ўборцы ўраджаю. Полк у сваіх шэрагах мае 48 чалавек калгаснікаў — сапраўдную і моцную апору партыі на вёсцы. Партыйна-камсамольская арганізацыя складае 45 проц. усяго складу палка. У палку мы маем 298 ваенкораў—лепшых ударнікаў-байцоў і камандзіраў, ідучых у авангардзе па баявой падрыхтоўцы. Гэтыя дасягненьні даюць поўную ўпэўненасьць у тым, **што полк і ў далейшым высока панясе чырвоныя сьцягі, даручаныя старым омцам за іх гэраічныя ўчынкі ў барацьбе з клясавымі ворагамі і будзе ў першых шэрагах у барацьбе за высокія тэмпы і якасьць баявой магутнасьці Чырвонай арміі—узброенага аплоту дыктатуры пралетарыяту.**

Глебаў.

Пабудуем магутную грамадзянскую авіацыю

У адзнаку 13-й гадавіны існаваньня слаўнай Н-й Омскай дывізіі і між народнага чырвонага дня **кампаніі склад** запасу Н. стралковага палку ўносіць **35 руб.** у фонд пабудовы грамадзянскай авіацыі (збор працягваецца) і выклікае пасьледваць гэтаму прыкладу начсклад запасу Н. стралковага палка.

Якушаў.

Адлічваем аднадзённы заробак

Пленум сэкцыі працы і забясьпекі па дакладу аб будаўніцтве грамадзянскай авіацыі пастанавіў:

Улічваючы важнасьць будаўніцтва грамадзянскай авіацыі і яе ролю ў справе сацыялістычнага будаўніцтва ў прамысловасьці, усім членам, кандыдатам і прымацаваным да сэкцыі працы і забясьпекі ўнесьці аднадзённы заробак.

Член сэкцыі **А. Сіпко.**

Заслухаўшы інфармацыю тав. Карпава аб значэньні грамадзянскага паветранага флёту, рабочыя і служачыя фабрыкі «Шэрсьць-вата» Белуціля пастанавілі адлічыць аднадзённы заробак у карысьць грамадзянскага флёту і выклікаюць праўленьне Белуціля і ўцільбазу пасьледваць іх прыкладу.

Бер.

ДАМО ЧЫРВОНАЙ АРМІІ СТОЙКАЕ, КЛЯСАВА-ВЫТРЫМАНАЕ, ФІЗЫЧНА-ЗДАРОВАЕ ПАПАЎНЕНЬНЕ.

Працоўныя СССР павінны ведаць гісторыю грамадзянскай вайны

УДЗЕЛЬНІКІ ГЭРАІЧНЫХ БОЕК ПАВІННЫ ДАПАМАГЧЫ Ў СКЛАДАНЬНІ ГЭТАЙ ГІСТОРЫІ

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 30 ліпеня 1931 г.

Ухваліць ініцыятыву т. Горкага і прыступіць к выданьню для шырокіх працоўных мас «Гісторыі грамадзянскай вайны» (1917—21 гг.) у 10—15 томах, у відзе зборнікаў навукова-гістарычных артыкулаў і літаратурна-мастацкіх твораў. Для рэдагаваньня «Гісторыі грамадзянскай вайны» утварыць: 1) галоўную рэдакцыю ў складзе тт. Горкага, Молатава, Варашылава, Кірава, Бубнова, Гамарніка і Сталіна; 2) гістарычную рэдакцыю ў складзе тт. Пакроўскага, Бубнова, Горкага, Яраслаўскага, Скрыпкіна, Гамарніка, Якаўлева, Яхундава, Сьцецкага, Папова і Эйдэльмана; 3) мастацкую рэдакцыю ў складзе тт. Горкага, Д. Беднага, Пацеева, Усевалода Іванова, Лявонава, Нікіценка, Чарота, Кіршона, Эйдэмана, Федзіна, Панферава і Кальцова.

Зварот М. Горкага

МАСКВА. М. Горкі зьвярнуўся да ўсіх удзельнікаў грамадзянскай вайны ў Расіі і пацярпеўшых ад белых інтэрвэнтаў і бандытаў з заклікам аб прысылцы сваіх успамінаў, запісак для скарыстаньня пры выданьні гісторыі грамадзянскай вайны.

— Дакумантаў шмат—піша М. Горкі,—але ўсё ж такі іх недастаткова для поўнага і праўдзівага асьвятленьня ўсіх падзей 1917—21 г.г. Неабходна, каб у гэтай вялікай і трудная рабоце прынялі актыўны ўдзел непасрэдныя ўдзельнікі грамадзянскай вайны: чырвонагвардзейцы, партызаны, чырвонаармейцы, камандзіры і ваенкомы тых гадоў, а таксама і людзі, пацярпеўшыя ад рабункаў і гвалту белых армій, атрадаў інтэрвэнтаў, ад шаек бандытаў і г. д. Трэба, каб усе людзі, якія памятаюць падзеі тых год, усе, што прымалі ўдзел у падзеях, запісвалі і прысылалі ў рэдакцыю «Гісторыі» свае запіскі.

«Гісторыя» ставіць сваёй мэтай паказ славутых боек рабочае клясы і працоўнага сялянства, паказ вялікіх учынкаў асобных заводаў і фабрык, чырвонагвардзейскіх і партызанскіх атрадаў і чырвонаармейскіх палкоў, перадаць маладому пакаленьню лепшыя традыцыі пралетарскай барацьбы.

Няхай жыве Чырвоная армія—верны вартаўнік савецкіх межаў

„Дзьвіна“, панчошная—вас выклікаюць

Чакаем тэрміновага адказу.

Учора ў абедзены перапынак, рабочыя 4-га вучастку пальтовага цэху фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі» заслухалі інфармацыю аб міжнародным чырвоным дні. У адказ на падрыхтоўку новай вайны супроць Савецкага Саюзу з боку імпэрыялістых усяго сьвету рабочыя 4-га вучастку прынялі зусім канкрэтнае, практычнае і вельмі карыснае рашэньне.

Гэты вучастак абвясьціў сябе ўдарным па выкананьні прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі і акрамя таго ўзяў на сябе наступныя абавязкі па ўзмацненьні абароннай работы на фабрыцы:

Усе рабочыя вучастку ўступаюць у члены Асоавіахэму.

Бяруць на сябе абавязак актыўна ўдзельнічаць у асоавіахэмаўскай рабоце ў якасьці ўнештатных інструктараў савету Асоавіахэму фабрыкі.

Абавязваюцца ўзяцца практычна за вайсковую вучобу.

Вучастак пальтовага цэху выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва фабрыкі «Дзьвіна» і панчошную.

Тэрмін сканчэньня дагавору—1-га студзеня 1932 году.

Арбітрам рабочыя абіраюць Цэнтральны Савет Асоавіахэму Беларусі.

М. Хованскі.

Становішча працоўных Нямеччыны пагаршаецца

БЭРЛІН. Становішча працоўнага насельніцтва Нямеччыны з кожным днём пагаршаецца. Пачаўшыся новы рост беспрацоўя бесьперапынна працягваецца. Па ўсёй Нямеччыне праходзіць новая хваля скарачэньняў і масавых звальненьняў. Ёсьць гарады, дзе 50 проц. насельніцтва беспрацоўныя. Нужда працоўнага насельніцтва павялічваецца ў зьвязку з падвышэньнем за апошні час цэн на прадукты харчаваньня. Колькасьць беспрацоўных, атрымліваючых мізэрную дапамогу, памяншаецца. У той час, як у студзені дапамогу па беспрацоўі атрымлівалі 52 проц. усіх беспрацоўных, у чэрвені гэтую дапамогу атрымлівалі толькі 36 проц. беспрацоўных.

У бліжэйшыя месяцы становішча нямецкага пралетарыяту яшчэ больш пагоршылася, з прычыны мяркуемага значнага зьніжэньня зарплаты ў зьвязку з надзвычайным дэкрэтам, які павялічыў падаткі, зьнізіў дапамогу па беспрацоўі, з прычыны ўзрастаньня цэн на прадукты першай неабходнасьці.

Згодніцкія прафсаюзы з усіх сіл стараюцца дапамагчы буржуазіі праводзіць націск на рабочую клясу. Згодніцкі саюз мэталістых даў сваю згоду на ажыцьцяўленьне пасрэднага рашэньня на зьніжэньне зарплаты мэталістым і патрабаваў, каб гэтае рашэньне абавязкова было ажыцьцяўлёна.

У радзе месц Нямеччыны адбываюцца забастоўкі ў знак пратэсту супроць зьніжэньня зарплаты і затрыманьня ў выплаце зарплаты. Ужо 7-мы дзень бастуюць 5.000 гарнякоў у Вілінгу, Саарскай вобласьці. Спробы дырэкцыі прарваць забастовачны фронт ня мелі посьпехаў. На радзе іншых прадпрыемстваў таксама робяцца спробы зьніжэньня зарплаты, аднак прадпрыемствы паўсюды наткнуліся на рашучае супраціўленьне рабочых. Абвешчана забастоўка рабочых лясного кіраўніцтва Ландгенабелан, з прычыны нявыплаты зарплаты і спроб лясного кіраўніцтва павесьці зьніжэньне зарплаты.

Узмацняецца белы тэрор

За апошні час белы тэрор у Кітаі на тэрыторыі нанкінскага ўраду значна ўзмацніўся. Сотні падазроных у камунізьме арыштоўваюцца і прысуджаюцца к працягламу турэм наму зьняволеньню, а часьцей ўсяго падпадаюць пад катаваньне і кару сьмерцю.

Рэвалюцыйны рух, ня гледзячы на гэты тэрор, узмацняецца. Кітайская паліцыя ў Шанхаі ўжо бясьсільна змагацца з мясцовым камуністычным рухам і заклікала на дапамогу вядомага ў Шанхаі бандыта Ду Юсэна, маючага шайку ў 10.000 чал., пры значнушы яго галоўкамандуючым па прыдушэньні камуністычнага руху. Члены шайкі Ду Юсэна маюць права арыштоўваць і вытвараць ператрусікі там, дзе пажадаюць.

Да суровай адказнасьці зрываючых правядзеньне гаспадарчага разрахунку

МАСКВА, 30. За апошні час паявіліся выпадкі ўмяшальства мясцовых органаў, у тым ліку і паасобных органаў РСІ ў апэрацыйную работу аддзяленьняў дзяржбанку, націскі на кіраўнікоў аддзяленьняў дзяржбанку і прымусы іх крэдытаваць гаспадарчыя арганы звыш ліміту, выдаваць неаплачаныя тавары і ня ўжываць прадугледжаныя законам рэпрэсіі да няспраўных платнікаў.

За подпісамі намесьніка НК РСІ СССР Анціпава разасланa дырэктыва, якая прапануе ўсім мясцовым органам РСІ ў месячны тэрмін праверыць праз кіраўнікоў аддзяленьняў дзяржбанку, меўшыя месца падобныя выпадкі і прыцягнуць да суровай адказнасьці па партыйнай, савецкай лініі ўсіх вінаватых у зрыве работы дзяржбанку па ажыцьцяўленьні пастаноў ураду і дырэктыў партыі аб крэдытнай рэформе і гаспадарчым разрахунку.

Адкрыўся ўсебеларускі зьезд прамкаапэрацыі

28-га ліпеня ў Доме культуры адкрыўся 4-ы ўсебеларускі зьезд прамысловай каапэрацыі. У рабоце зьезду прымаюць удзел 250 дэлегатаў, якія прадстаўляюць 50 тыс. членаў арцеляй Белкааппрамсаюзу.

Зьезд адкрыў старшыня Белкааппрамсаюзу тав. Брыскін, які адзначыў, што зьезд павінен вызначыць канкрэтныя шляхі для рэалізацыі дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове работы прамкаапэрацыі і ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну.

У ганаровы прэзыдыум абраны палітбюро ЦК УсеКП(б), а таксама тав. Гай, Шаранговіч і Галадзед.

Ад імя ЦК КП(б)Б і ўраду БССР зьезд вітаў нам. старшыні Саўнаркому тав. Бэнэм, які падкрэсьліў, што прамкаапэрацыя ў сваёй далейшай рабоце павінна аддаць асаблівую ўвагу разгортваньню промыслаў па торфе і цэглы. Наогул павінен быць узяты больш рашучы курс на развіцьцё промыслаў, якія працуюць на не дэфіцытнай мясцовай сыравіне. Посьпехі ў гэтай галіне трэба прызнаць недастатковымі.

Дэлегацыя Гомельшчыны перадала зьезду чырвоны сьцяг.

На гэтым-жа пасяджэньні зьезд перадаў некаторым арцелям БССР дыплёмы і ганаровыя лісты, атрыманыя ад усебеларускай сельска-гаспадарчай і прамысловай выстаўкі за лепшыя экспанаты.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і ўсесаюзнаму каапэрацыйна-прамысловаму савету.

Менскія ўдарнікі прамкаапэрацыі арганізавалі вялікую дэманстрацыю, якая накіравалася да Дому культуры, дзе вітала зьезд.

Грамадзкае ганьбаваньне

Нарсуд 3-га вучастку гор. Віцебску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне: б. загадчыку фруктовага складу ЦРК Шубіку Фаліне Залманавічу на падставе 213 арт. КК, за тое, што ён, узяўшы пажарную машыну для выкачваньня вады з падвалу, пакінуў яе ва двары, дзе яна праз значны час была выяўлена завеяная сьнегам і з замёршай вадой у ваданасосным клапане.

Былому прадаўцу кніжнага кіоску ст. Віцебск Фралову Лінсею Іванавічу, на падставе 196 арт. КК, з санкцыяй 213 арт. КК, за тое, што ён пры наліччы ў касе дробнай манеты, адмовіўся выдаць здачу.

Былой загадчыцы буфэтам пры бальніцы імя Калініна Драгенскай Таццяне Кастусевай, на падставе 250-а арт. КК, за тое, што яна прадавала цукеркі па падвышанай цане.

Нарсуд 4-га вучастку гор. Віцебску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. выхавальніцы дзіцячага ачага пры Віцебскім фанэрным заводзе Новікавай Таісе Аўдзеевай за нядбайныя адносіны да працы

Экспедытару Віцебскага фанэрнага заводу Літвінскому Янку Янкаву за нядбайныя адносіны да працы.

Б. загадчыку гаспадаркай лячэбніцы пры фабрыцы «Дзьвіна» Паўлаву Сяргею Міхасеву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Віцебскі міжраённы нацыянальны яўрэйскі нарсуд абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне дзесятніку камунаддзелу, працуючаму ў ЖАКТ'е № 11, Самерсаву Ямубу Абрамавічу за службовы ўчынак, прадуглед. 213 арт.

Да ведама ўсіх бюро дэпутацкіх груп, старшынь фабзаўкомаў

2-га жніўня, а 7 гадз. увечары, у залі паседжаньняў гарпрафсавету (Палац працы, пакой № 11) склікаецца нарада ўсіх бюро дэпутацкіх груп і старшынь ФЗМК па пытаньні

разгортваньня савецкай работы на прадпрыемствах.

Даклады аб сваёй рабоце зробяць старшыні наступных дэпутацкіх груп і фабзаўкомаў: фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі», заводу «Чырвоны мэталіст», панчошнай фабрыкі і акулярнай фабрыкі.

Нарада заслухае даклады брыгад гарсавету аб выніках абсьледваньня становішча савецкай работы на прадпрыемствах Віцебску.

Нараду склікаюць: Гарком КП(б)Б,
Гарсавет,
Гарпрафсавет.
рэд. газэты «Савецкая Беларусь»,
рэд. газ. «Віцебскі Пралетар»,

Да ведама рабкораў каапэрацыі

Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні гарпрафсавету (Палац працы, пакой № 20 рэдакцыі газэт «Савецкая Беларусь» і «Віцебскі Пралетары» і гарком КП(б)Б склікаюць нараду рабкораў каапэрацыі з наступнай абвесткай дня:

1. Вынікі работы каапэрацыйнай сэкцыі другога Усебеларускага зьезду рабселькораў.
2. Папярэднія вынікі агляду спажыўкаапэрацыі Віцебску.

На нараду павінны зьявіцца ўсе рабкоры Віцебку, якія пішуць аб рабоце спажыўкаапэрацыі.

Яўка абавязкова і точна ў вызначаны час.

Гарком КП(б)Б.
Рэд. газ. «Савецкая Беларусь».
Рэд. газ. «Віцебскі Пралетары»

Што чытаць аб міжнародным чырвоным дні 1-га жніўня

А. Ваенная небясьпека і пагроза інтэрвэнцыі

Для падрыхтаванага чытача

Варашылаў К.—На гістарычным перавале.

Ленін.—Аб інтэрвенцыі. Матар'ял для дакладчыкаў.—М. Адзв. «Маскоўскі рабочы», 1931. 232 стар. 75 к.

Лумачарскі А.—Як яны разбройваюцца.—Л. «Прыбой» 1931 г. 47 стар. За і супроць СССР. К крыжоваму паходу супроць СССР. Матар'ялы і дакуманты. Склалі: І. Вар'яш і О. Валькоўская. Пад рэд. і з прадмовай Ю. В. Гальдштэйна.—М. «Маскоўскі рабочы». 1930. 116 стар.

Блюменталь Ф. — Палітычная падрыхтоўка буржуазіі к вайне.—М. Выд. «Маскоўскі рабочы». 1929. 170 стар. 45 к.

Бубноў А.—Ваенныя пляны і ваенная сапраўдкасьць сучаснага імпэрыялізму. М. Дзв. 1929. 46 стар. 10 к.

Сталін і Кагановіч Л.—Справаздача Цэнтральнага камітэту зьезду УсеКП(б) М. Дзв. 1930. 185 стар. 35 к.

Працэс прампартыі 25 лістапада—7 сьнежня 1930 г. Сьценаграма судовага працэсу і матар'ялы, далучаныя да справы.—М. Адзв. выд. «Савецкае законадаўства» 1931. 541 стар. 1 р. 75 к.

Шпегі і шкоднікі перад пралетарскім судом. Паказы Рамзіна. — М. Адзв. «Маскоўскі рабочы» 1930 г. 198 стар. 20 к.

Працэс контррэвалюцыйнай арганізацыі меншавікоў Выд. Адзв. «Савецкае законадаўства» М. 1931. 472 стар. 1 р. 60 к.

Рубінштэйн М.—Імпэрыялістычныя войны будучага.

Для масавага чытача

Варшылаў І.—Пагроза вайны. Аддзел ваенны літ-ры. М. і Л. Дзв. 1930. 134 стар. 45 кап.

Асьлібекян С.—Пагроза вайны.—М. «Маскоўскі рабочы» 1931. 30 стар. 10 к.

Варман Я. — Як Ленін змагаўся супроць імпэрыялістычнай вайны.

Блюменталь Ф. — Як імпэрыялістыя рыхтуюць вайну.—Дзяржв. М. і Л. 1930. 48 стар. 48 к.

Варшылаў К. — Ці будзе вайна.—«Маскоўскі рабочы». 1930. 28 стар. 1 кап.

Вальнісні. — Ад вайны к вайне. Выдав. 3-е—ЦК МОПР СССР, 1930. 48 стар. 15 к.

Прысуд над контррэвалюцыйнай арганізацыяй меншавікоў — М. і Л. Адзярж. «Маскоўскі рабочы». 1931. 128 стар. 18 к.

Горні. — Калі вораг не здаецца, яго зьнішчаюць. Адзяржв. «Маскоўскі рабочы» М. і Л. 1930. 16 стар. 1 кап.

Капіталістычнае абкружэньне СССР і барацьба працоўных усяго сьвету. Падзел V. Праграма палітзаняткаў з чырвонаармейцамі. Дзяржв. ваен. выд. М. 1931. 96 стар. 25 к.

Куно. — Як буржуазія дрэсыруе моладзь для будучай вайны.—М. і Л. Выдав. «Маладая гвардзія». 1929. 64 стар. 20 кап.

Лозані, Ст.—Як Францыя сёньня абараняецца. Адзяржв. «Маскоўскі рабочы» М. і Л. 1931. 63 стар.

Харытонаў Н. — Прампартыя—агент імпэрыялізму. Дзярж. ваен. выд. 1930. 39 стар. 10 к.

Б. Камінтэрн і міжнародны пралетарыят у барацьбе супроць новых войн

Для падрыхтаванага чытача

Супроць імпэрыялістычных войн. Стэнаграфічная справаздача VI кангрэсу Камінтэрну. Вып. 2. Дзяржв. М. і Л. 1929. 203 стар.

Супроць вайны—Пытаньне аб вайне на VIII пленуме выканкому Камінтэрну. Дзяржв. М. і Л. 1929. 96 стар.

Аб міжнародным чырвоным дні. X пленум выканкому Камінтэрна. Вып. 2-гі. Дзяржв.—М. і Л. 1929. 80 стар.

Тэзісы, рэзалюцыі і пастановы XI пленуму ІККІ. 1. Аб задачах сэкцый Кам. Інтэрнацыяналу. 2. Аб узмацненьні пагрозы ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР і задачы камуністых. 3. Пастановы.—Адзяржв. «Маскоўскі рабочы. М. 1931. 32 стар. 10 к.

Аб выніках XI пленуму ІККІ. Матар'ял для дакладчыкаў і сеці партасьветы. Адзяржв. «Маскоўскі рабочы».—М. і Л. 1931. стар. 25.

Для масавага чытача

Геннін Л.—Нашы прыхільнікі ў стане ворагаў. Выд. 2-е занова перароб. і дап. 1931. 64 стар. 15 кап.

Кашэн М.—Супроць паклёпаў на Савецкі Саюз. Дзяржв. М. 1930. 46 стар. 5 к. (гл. таксама прамову М. Кашэна ў газэце «Правда» ад 15 сакавіка 1931 г.).

Кашэн М.— Францыя—Арганізатар інтэрвэнцыі. Адзяржв. «Маскоўскі рабочы» М. 1931 г. 112 стар.

Уткес Д.—Першае жніўня.—... выд. ЦК МОПР. 1931. 32 стар.

В. Абарона СССР

Для падрыхтаванага чытача

Блументаль Ф.—Друк і абарона. У дапамогу рабкорам, селькоркам, газэтным работнікам.—М. выд. «Маладая гвардзія». 1931 г. 77 стар. 70 кап.

Какорын М.—Абарона СССР. Пяцігодка. 2 дадатк. выд.—М. Ваен. выд. 1930. 48 стар. 12 к.

Какорын М.—Партактыў і задачы абароны СССР. — М. выд. 1930. 96 стар. 40 к.

Леонардаў Б.—Чым пагражае ваенная авіацыя і хэмія грамадзянскаму насельніцтву і як ад іх абараняцца.—М. і Л. выд. 1930 г. 128 стар. 75 к.

Рабіновіч С.—XVI зьезд УсеКП(б), абарона краіны і чырвоная армія. Дзяржв. 1930. 64 стар. 12 к.

Для масавага чытача

Брагін М.—Аб ваеннай работе камсамолу.—М. выд. «Маладая гвардзія». 1930. 63 стар. 20 к.

Валацкой І.—Заводы і пашы абароне. Выд. 3-е Дзярж. ваен. выд. 1931. 31 стар. 18 к.

Варашылаў К.—Прамова на зьезьдзе УсеЛКСМ.

Галакціонаў С.—За перамогу сацыялізму. — М. Ваендзяржв. 1930. 32 стар. 10 к.

Какорына З.—Работніца, вывучай ваенную справу.—М. і Л. Дзяржв. 1930. 32 стар. 8 к.

Камсамол—шэф авіацыі. Зборнік. Выд. «Маладая гвардзія». 1931. 32 стар. 17 к.

Семашка Н.—1 е жніўня і задачы Асоавіахэму.—М. Ваендзяржв. 1931. 64 стар. 15 к.

Сідараў А.—Як камуністыя і камсамольцы дапамагаюць мабілізацыі. М. і Л. Дзяржв. 1930. 40 стар. 10 к.

Сьмірноў Я.—Ваенна-палітычнае выхаваньне юных піянэраў СССР. М. і Л. «Маладая гвардзія» 1930. 32 стар. 6 к.

Старлін С.—Мабілізацыя і задачы ваеннага актыву. М. Ваендзяржв. 1931. 40 стар. 12 к.

Старлін С.—Чым насельніцтва дапаможа Чырвонай арміі ў час будучай вайны. 2 выд.—М. Ваендзяржв. 1930. 30 стар. 8 к.

Фрумін С.—Камсамол, мацні абарону СССР.—М. «Маладая гвардзія». 1930. 79 стар.

1. augusta Latv. kluba darsa notiks

plass stradneeku un kolektivistu vakars.

Deenas kartiba:

1. Latvju kolektivistu un stradneeku treeceeku raporti.
2. „Voikava“ drampulcina un kluba Zilas bluses preeksnesumi.

Ragu orkestrs. Pasdarbiba.

Ee-eja briva. Biletes kluba kancleja. Sakums noteikti pulksten 8 vakara.

Komisija.

— Сёньня, а 8й гадзіне ўвечары, у гарсавеце (пакой № 33) адбудзецца нарада ліквідатараў няпісьменнасьці і культармейцаў. Фабкомы павінны забясьпечыць яўку культармейцаў.

На парадку дню: даклад інспэктара наркамасьветы аб падрыхтоўцы да навучальнага году (дакладч. т. Сьцепанюк).

— Дзетдомы і ячэйкі павінны тэрміново атрымаць абутак для дзяцей, згодна разьмеркаваньня, з магазыну па Шасейнай вул. № 2, не пазьней 2 га жніўня.

— Віцебская гарКК РСІ і праўленьне ВОРС'у склікаюць шырокую нараду па пытаньні мерапрыемстваў па палепшаньні якасьці выробаў цэглы. Нарада адбудзецца 2 га жніўня, а 6 гадз. увечары, у клюбе будаўнікоў (Валадарская вул., у дварэ чырвонаармейскага кіно). На нараду павінны зьявіцца: ворсаўскі актыў, трохкутнікі цагельных заводаў і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал бударганізацыі.

— Сёньня, а 10 гадз. раніцы, у памяшканьні РСІ (Замкавая, 26) склікаецца сход прадстаўнікоў навучальных устаноў школ будкантор, белдзяржаб'яднаньня, Белсельбуду, чыгунбуду, Белпэдтэхнікуму, пэдінстытуту, яўрэйскага пэдтэхнікуму, вэтінстытуту, электратэхнікуму і ўсе работнікі і гарінспэктар палітпрасьветы.

— 2-га жніўня, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні гаркому КСМБ адбудзецца паседжаньне канфліктнай камісіі, на якое выклікаюцца наступныя тт.: Бубноў Д. К.—швэйная фка, Стайнова А.—МБВ чыг., Абеліта—Лужасьнянскі тэхнікум, Баскіна С.—швэйны тэхнікум, Папкоў Н. В.—палітэхнікум, Іофік—«Прафінтэрн», Хейфец, Холмачоў—Белпэдтэхнікум.

— Гарсавет Асоавіахэму пачынае набор на канструктарскае аддзяленьне школы плянэрыстых.

Усе даведкі і ўмовы прыёму магчыма атрымаць у доме Чырвонай арміі (пакой № 11) ад 6 да 8 гадз. у тав. Бельчыкава.

— 2 га жніўня, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні РСІ (пакой № 2), склікаецца сход старшынь шэфскіх брыгад і трохкутнікаў наступных прадпрыемстваў: фабрыкі Лекерта, «Прафінтэрн» № 1, скурзаводу, шчацінная, панчошнай, акулярнай і заводу «Чырвоны мэталіст».

— 3-га жніўня, а 6-ці гадз. увечары, у памяшканьні РСІ (пакой № 2) склікаецца нарада па пытаньні забясьпячэньня навучальных устаноў наступных арганізацый: прадстаўнік ЦРК, сампрамсаюзу, інспэктар забясьпячэньня, тэкстыльаб'яднаньня, скурзаводу, «Прыхільнікі дзяцей», інспэктар палітасьветы і т. Пятрова.

Час. вык. аб. рэдактара Н. Баруноў.

УЗП БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Пач. а 8½ гадз. увеч.
Біл. прад. у касе тэат. з 12 да 4 гадз. дню і з 5 да 10 гадз. увеч.
З 4 га жніўня АДКРЫЦЬЦЁ ГАСТРОЛЯЎ ЛЕНІНГРАДЗКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ АКТОРСКАГА МАСТАЦТВА.
4, 5 16 жніўня ВЫБУХ. Рэжысэры А. С. Віўен і Н. Н. Галін. Мастак Шварц.

ГАРТЭАТР (Канатная вуліца). ГАСТРОЛІ РАСІЙСКАЙ ОПЭРЫ пад кіраўніцтв. Я. Е. Воўкава.
Нядзеля, 2-га, жніўня, АІДА ў 4 х дзеях, 7 мі малюнках, музыка Д. Вэрдзі.
Панядзелак, 3-га жніўня, РУСАЛКА ў 4-х дзеях, 6 малюн., муз. Даргамыжскага.
Пачатак а 9 гадз. увеч. Білеты ў касе тэатру.

БЕЛДЗЯРЖКІНО З нанядзелка, 27-га ліпеня
СПАРТАК Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Толькі 1 дзень—сёньня, 1-га жніўня, нашумеўшая карціна паводле апавяданьня М. Горкага МАЦЬ
МАСТАЦКІ Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Толькі 2 дні: 1-га і 2 га жніўня, савецкі фільм Чорны слуп
ПРАЛЕТКІНО Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Спяшыце бачыць, толькі 1 дзень—сёньня, 1-га жніўня, вядомы нашумеўшы фільм ОВОД

З 1-га па 20 е жніўня 1931 г. адчынен прыём заяў на 1 ы курс ВІЦЕБСКАЙ КІНОПРАФШКОЛЫ
Кінопрафшкола падрыхтоўвае кваліфікаваных кіномэханікаў і арганізатараў кіносправы, а таксама падрыхтоўвае ў кіноВТУЗ'ы.
Прыём у кінопрафшколу на базе 7-годкі ня менш 16 год узросту.
Слухачам будзе выдавацца стыпэндыя.
К заявам павінны быць прыкладзены дакуманты: 1) пасьведчаньне аб сканчэньні 7-годкі, 2) мэтрыка і 3) анкета.
У першую чаргу будуць прыняты ў школу: рабочыя, калгасьнікі, батракі, беднякі, а таксама і іх утрыманцы.
Адрас кіно школы: ст. ВІЦЕБСК МБВ чыг., 3-я чыгуначная школа ФЗС, чыгун. будынак № 8.
Канцалярыя школы адчынена штодзённа ад 11 да 14 гадзін.
Белдзяржкіно. 1055—10—1

ЧЫРВОНААРМЕЙСКІ КІНО-ТЭАТР
Сёньня, у суботу, 1-га і заўтра, ў нядзелю, 2-га жніўня, замежны баявік
Пасынкі Бэрліна
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. 1036—2—2

Вячэрні палітэхнікум
абвяшчае прыём заяў на аддзяленьні: мэханічнае, студзёнай апрацоўкі мэталяў, цёпла-тэхнічнае і электра-тэхнічнае.
Лік вакансый: на 1-ы курс—180 чалавек, на 2 гі курс—11 чалавек, на 3-і курс—16 чалавек.
Прымаюцца рабочыя розных саюзаў, працуючыя на мэталёвай, электра-тэхнічнай ці іншай блізкай спэцыяльнасьці, маючыя стаж ня менш 2-х год і скончыўшыя сямігодку ці падрыхтоўчыя курсы. Ня маючыя гэтай адукацыі, павінны трымаць іспыты.
Да заявы прыкладаць дакуманты: аб сацыяльным становішчы сваім і бацькоў, аб стажы, аб адукацыі і анкету, зацьверджаную прафсаюзнымі ці савецкімі арганізацыямі. Заявы прымаюцца з 20-га ліпеня да 15 е верасьня у канцэлярыі палітэхнікуму, як днём, так і ўвечары. 989—3—3

ВІЦЕБСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ
абвяшчае прыём на 1-ы курс вэтінстытуту
на дзённае аддзяленьне ў ліку 90 асоб, вячэрняе—60 асоб, 250 асоб на завочнае навучаньне і на 1-ы курс вэттэхнікуму—102 асобы.
Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку Наркамасьветы на 1930|31 навучальны год.
Прыём заяў для жадаючых паступіць як у вэтінстытут, так і ў вэттэхнікум будзе працягвацца да 15-га жніўня, з якога часу пачынаюцца іспыты для нямаючых належнай адукацыі.
Пачатак заняткаў 1-га верасьня г. г.
Заявы накіроўваць па адрасу: Віцебск, вэтінстытут.
Дырэкцыя інстытуту. 1015—3—3

ВІЦЕБСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ БІБЛІЯТЭКІ (Валадарская, 3)
пасьля палугадавога перапынку адчыняе сваю дзейнасьць з 15 га жніўня і будзе адчынена штодзённа з 12 да 3 гадз. дню і з 6 да 10 гадз. увеч.
У бібліятэцы поўнасьцю ўкамплектаваны аддзел беларускай кнігі, значна папоўнены аддзелы па тэхніцы і грамадзкім навукам, упарадкаваны архіў старой кнігі. Маюцца ўсе навуковыя часопісы на расійскай і беларускай мовах, а таксама і замежныя выданьні: на ангельскай, нямецкай і французкай мовах. Выпісаны ўсе цэнтральныя і беларускія газэты.
Пры бібліятэцы маецца агульная чытальня і пакоі для навуковае працы, якія адчынены ў гадзіны, калі адчынена бібліятэка.
Бібліятэка абслугоўвае: навуковых працаўнікоў, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, настаўнікаў, студэнтаў, вынаходцаў і рабочых-ударнікаў, якія займаюцца навукова дасьледчай працай.
Кнігі, часопісы і газэты на дом не выдаюцца.
Літаратура, забароненая Галоўлітам, выдаецца толькі з дазволу загадчыка бібліятэкі для навуковай працы.
Заг. Віц. аддзяленьня С. Шчуцкі.
1039—5—1

У нядзелю, 2 га жніўня, а 7 гадзін увечары, у клюбе «Мэдпрацаўнік», адбудзецца
2-ая ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ
А 5-й гадзіне—фракцыя.
Запрашаецца ўвесь актыў чырвонага крыжу.
Камітэт Чырвонага крыжу. 1052—2—2

Сэктар кадраў ЦРК ставіць у відомасьць таварышоў, падаўшых заявы на
РАХУНКАВОДНЫЯ КУРСЫ,
што апошнія павінны зьявіцца за вынікамі прыёму ў сэктар кадраў ЦРК сёньня, 1-га жніўня (3 і паверх), да 3-х гадз. дню. 1058—2—2

АБВЯШЧАЕЦЦА, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ у ВІЦЕБСКІ ПАЛІТЭХНІКУМ працягнуты да 25-га жніўня,
прычым набор студэнтаў вытвараецца на наступныя аддзяленьні—энэргетычнае: 1) па электрыфікацыі фабрык і заводаў—30 чал., 2) электрыфікацыі сельскай гаспадаркі—30 чал., 3) цеплатэхнічнае—30 чал; мэханічнае аддзяленьне: 1) па студзёнай апрацоўцы мэталяў—30 чал., 2) па гарачай апрацоўцы мэталяў—30 чал., 3) на мэханікаў па абутковых машынах—30 чал.
Апрача гэтага адкрыт прыём на другі курс палітэхнікуму на энэргетычнае аддзяленьне: 1) па электратэхнічнай сэцыяльнасьці—5 чал., цёплатэхнічнай—5 чал; мэханічнае аддзяленьне: 1) па студзёнай апрацоўцы мэталяў—8 чал. і на 3-ці курс—10 чал., з якіх 5 чал.—на электратэхнічнае і 5 чал.—на мэханічнае аддзяленьне.
На другі і трэці курсы прымаюцца асобы, скончыўшыя прафтэхшколы ці ФЗВ на базе сямігодкі з двухгадовым вытворчым стажам, выключна рабочыя і галоўным чынам ударнікі. Для асоб, жадаючых паступіць на 3 ці курс, устанаўляюцца залікі.
Дакуманты падаюцца згодна правіл паступленьня ў тэхнікум.
1020—3—2 Дырэкцыя.

СТАРАСЕЛЬСКАЯ ДРЭВААПРАЦОЎЧАЯ ШКОЛА ПРАМЫСЛОВА-КААПЭРАЦЫЙНАГА ВУЧНЁЎСТВА
аб'яўляе восенны набор вучняў.
Заявы прымаюцца да 20-га верасьня. Паступаць могуць хлопцы і дзяўчаты ў узросьце ад 15 да 19 год з адукацыяй 4-х груп. Школы тыпу ФЗВ рыхтуе сталяроў-мэблёўшчыкаў і бандароў і прадаўжае агульную адукацыю. Тэрмін навучаньня 2 гады. Усе вучні забясьпечваюцца інтэрнатам, сталовай і атрымліваюць зарплату па разрадах адпаведна кваліфікацыі. 1-ы разрад—25 руб. Для паступленьня патрэбны дакуманты: аб адукацыі, узросьце, сацыяльным становішчы, падатку, здароўі і анкеты ўстаноўленай формы.
Адрас—п/ч, Старае сяло, Віцебскага раёну, прафшкола. 1060—5—1

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакуманты, якія лічыць несапраўднымі:

Па гораду:

Чл. білет саюзу скурнікаў № 156377 Е. М. Прус 4407
Чл. білет саюзу будаўнікоў № 25—5758 Д. М. Беспалікава 4331
Чл. біл. саюзу дрэваапрацоў. Е. І. Савіцкай 4333
Кн. «Прыхільнікі дзяцей» Е. І. Савіцкай 4334
Каап. кн. «Змычка» Е. К. Кібісава 4335
Кн. «Прыхільнікі дзяцей» 4410 Я. І. Казлова 4336
Дзьве мэтрыкі А. і С. Раманавых 4337
Пропуск панч. фабрыкі № 1580 З. Ф. Осіпавай 4338
Прадукт. ліст ЦРК А. К. Шыфровай 4339
Табак. картка І. Е. Алімпіева 4415
Укл. картка да паяв. кн. ТПО № 80173 Н. П. Піталенка 4416
Квіток пачын. майстэрні ЦРК па Ленінскай № 4587 Л. Х Беляевай 4417
Абл. 3 йпаз індустр. проц. сэр. №№ 033318, 19, 20, 21, 22, 54, 55, 56, 57, 58, разам на 50 р. М. І. Шчыцікавай 4418
Член. білет саюзу скурнікаў І. С. Вейц 4419
Паяв. кн. і наборн. ЦРК, прамтав., прад. наб. ліст і ўкл. картка Г. І. Яўсеева 4420
Кніжка «Прыхільнікі дзяцей» Г. І. Яўсеева 4421
Тры хлебн. карткі за красавік З. І. Басіна і картка яго жонкі Даворыц 4422
Пасьведч. асабов., выдан. Каралёўскім сельсаветам У. М. Ісачанка 4423
Вайсковая кніжка і чл. білет саюзу хэмікаў П. І. Чумакова 4424—4425

Знойдзены дакуманты і дастаўлены ў кантору «Віцебскі Пралетары»: прадуктовыя і прамтаварныя лісты Бяручкіна, прадуктовы ліст Грышчанка, кніжка саюзу скурнікаў Г. М Шмэрлінг, абедзеная кніжка сталовай № 17 Каплан, часовае пасьведчаньне ЛКСМ і іншыя дакументы М. Ф. Загрышчанка, прадуктовы ліст і іншыя дакументы М. Г. Грэбнёва
За атрыманьнем зварочвацца ў к-ру з 3—5 гадзін.

Выпуск № 1. Друкарня «Калектыў», Замкавая, 10. Тыраж 10.000